МАМА
«КАЛЫХАНКІ»

Сямейная кадрыля

ВЫХАВАННЕ
ПА РАСКЛАДЗЕ

Сямейная кадрыля

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛІПЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 141 (28757)

ЛІЧБА ДНЯ

3168 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак

налічваецца сёння ў нашай краіне. У іх карыстанні знаходзіцца 180 тыс. га зямлі. Сярэдні памер зямельнага ўчастка ў фермерскіх гаспадарках складае каля 78 гектараў. Асноўная спецыялізацыя — раслінаводства. Аб'ёмы вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ў фермерскім сектары ў параўнанні з 2011 годам узраслі ў два разы. Рэнтабельнасць продажаў за апошнія шэсць гадоў не апускалася ніжэй за 17 %. Удзельная вага фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці сельгаспрадукцыі складае больш за 2 %.

КАРАТКА

- Першы мільён тон збожжа новага ўраджаю сабраны ў Беларусі.
- **25 ліпеня фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» ўстанавіў партнёрскія адносіны з грамадскім аб'яднаннем «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

- Да 2021 года чаканне навасельля для шматдзетных сем'яў не павінна перавышаць год. Аб пастаўленай задачы заявіў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін.
- **У Беларусі ўводзіцца паведамляльны парадак правядзення масавых мерапрыемстваў.**
- У Мінску расходы на зборы дзіцяці ў школу складуць у гэтым годзе ад BYN202 да BYN890 у залежнасці ад паўнаты камплекта і ўзросту вучня.

ISSN 1990 - 763X

■ Свая справа

Пячнік, канструктар, філосаф

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Чалавек славіцца сваёй працай. Славу печніку прыносіць яго ручная, дакладней, мадэльная работа: печы, грубкі, каміны, пячныя камбайны — гэтыя адвечныя агмені жыцця. Валерый ЯФРЭМАЎ, жыхар вёскі Лісна Верхнядзвінскага раёна (на гэтым фота), заканчвае працу над сваім чарговым пячным творам. І гэтым самым творца «ажывіў» яшчэ адзін дом: у вёсцы Мілавіды Расонскага раёна для маладой сям'і навукоўцаў-біёлагаў ён спраектаваў і «запусціў» ужо дваццаты ў яго кар'еры пячны комплекс, які складаюць шчыток-грубка для абагрэву памяшкання, пліта, камін і духоўка.

Пра адзін дзень працы ліснянскага печніка на адным прыкладзе, дакладней, на адной печы, мы сёння і раскажам.

СТАР. 13

■ Прыёмная кампанія — 2018

Вышыні, якія давялося скарыць, каб стаць студэнтам

На хвалі інтарэсу — англійская мова, біятэхналогіі і «фармацэўтычная хімія»

Праз некалькі дзён завершыцца залічэнне на бюджэтную форму навучання ў ВНУ. А тым часам вышэйшыя навучальныя ўстановы працягваюць дзяліцца першымі вынікамі прыёмнай кампаніі.

Адным з першых імёны шчаслівых першакурснікаў агучыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Максімальны прахадны бал склаўся сёлета тут на перакладчыцкім факультэце: на спецыяльнасці «англійская і другая замежная мова» (спецыялізацыя — мастацкі пераклад, спецыяльны пераклад, сінхроны пераклад) — 381, «нямецкая і другая замежная мова» з той жа спецыялізацыяй — 375, «арабская мова і другая замежная мова» — 351 і «французская мова» — 338.

На факультэце кітайскай мовы і культуры не менш як 381 бал трэба было мець тым, хто пажадаў стаць перакладчыкам з кітайскай мовы (спецыялізацыя — спецыяльны пераклад) і 338 балаў — пры паступленні на спецыяльнасць «кітайская і другая замежная мова» (спецыялізацыя — камп'ютарная лінгвістыка і руская мова як замежная).

На факультэт англійскай мовы прахадны бал склаў 324. Для вучобы на факультэце нямецкай мовы патрабавалася мець не менш як 313 балаў (калі абітурыенты на ЦТ здавалі нямецкую) або 323 (калі здавалі англійскую). На факультэце раманскіх моў прахадны бал для іспанскай мовы склаў 322, для французскай —- 319.

На факультэце міжкультурных камунікацый прахадной планкай для англійскай мовы сталі 369 балаў, нямецкай — 354, італьянскай — 360.

СТАР. 2

■ Рэпарцёр

МОРА БОЛЬШ НЕ ХВАЛЮЕЦЦА

Як забяспечваюць парадак у зонах адпачынку

Нягледзячы на тое, што сёлета надвор'е зусім не радуе нас пастаянствам, многія мінчане пры першай жа магчымасці імкнуцца адправіцца на прыроду. А дзе найлепшы летні адпачынак? Вядома, на моры. Вось і арыентуюцца на яго — сваё, блізкае і роднае, Мінскае мора. Тым больш што прыгажосці яму не займаць, ды і добраўпарадкаванне тэрыторыі за апошнія гады тут выйшла на новы ўзровень. Яшчэ адзін немалаважны паказчык — спакой. І сапраўды, на першы погляд, тут цішыня ды благадаць. А вось, што стаіць за гэтым і якія намаганні прыкладаюцца, каб падтрымліваць такую атмасферу, мы і пастараліся сёння высветліць.

СТАР. 15

9 771990 763008 18141

■ Блізкая ўлада

ВЫЙСЦЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ

Дзевяць зваротаў разгледзеў на асабістым выязным прыёме грамадзян у Крупках старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА. Сярод іх — традыцыйныя, з якімі звяртаюцца да губернатара і жыхары іншых раёнаў: рамонт даху жылога дома, добраўпарадкаванне і асфальтаванне вуліц, зямельныя і маёмасныя спрэчкі.

Васіліна Мікалаеўна і яе муж Раман Юр'евіч з аграгарадка Замкі хвалююцца, што могуць застацца без даху над галавой. Справа ў тым, што птушкафабрыка «Кляновічы» перададзена адкрытаму акцыянернаму таварыству «Агракамбінат «Дзяржынскі». Жыллё засталося на балансе былога ўласніка ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Агракамбінат Мачулішчы».

Пытанне заяўніцы можна вырашыць станоўча, калі жыллё будзе перададзена агракамбінату «Дзяржынскі». У гэтым выпадку тыя, хто працуе на птушкафабрыцы, будуць мець права на выкуп жылых памяшканняў. На сённяшні дзень такіх падстаў у жанчыны няма.

Усяго ж у адрас кіруючай кампаніі было трынаццаць аналагічных зваротаў, тры з іх задаволены, паколькі пададзены своечасова — да пачатку працэдуры рэарганізацыі.

— Мы не спыняем дагавор найму жылога памяшкання, не ставім перад сабой задачу выселіць людзей. Разглядаем варыянты, як можна пасадзейнічаць грамадзянам у вырашэнні пытання, — сцвярджае прадстаўнік кіруючай кампаніі.

— Што датычыцца заканадаўства, то «Мачулішчы» маюць абсалютную рацыю. А вось з жыццёвага пункту гледжання можна зразумець і хваляванні людзей, — канстатаваў губернатар. — Думаю, найлепшае выйсце — прадоўжыць дагавор найму жылля, каб людзі жылі спакойна. А далей у рабочым парадку будзем разбірацца, вырашаць пытанне.

Жыхар пасёлка Крупскі Іван Іванавіч наракаў, што ў яго кватэры восенню і зімой вільготныя сцены, паколькі з даху сцякае вада. Карэспандэнт «Звязды» разам з калегамі і гаспадаром па просьбе Анатоля Ісачанкі пабывалі ў кватэры. Напярэдадні прайшоў моцны лівень, але слядоў патопу не відаць: сцены сухія, без характэрных плям ад заліванння. Ды Іван Іванавіч стаяў на сваім: прыедзьце восенню. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна даў даручэнне службам жыллёва-камунальнай гаспадаркі праверыць дах яшчэ раз бліжэй да халадоў.

Як часта бывае, на прыём да губернатара запісаліся і жыхары іншых раёнаў. Напрыклад, жыхарка аграгарадка Хацежына Мінскага раёна Галіна Аляксандраўна паскардзілася, што васьмікватэрны жылы дом здадзены з недаробкамі. У падвале вада, на сценах — расколіны. Жыльцы звярталіся з іскам у суд. Будаўнічая арганізацыя прапаноўвае міравую і сорак тысяч рублёў кампенсацыі. Але жанчына ўпэўнена, што ліквідаваць усе хібы за такую суму немагчыма.

Анатоль Ісачанка паабяцаў дасканала вывучыць сітуацыю з прыцягненнем спецыялістаў і даць адказ.

Вольга Віктараўна з таго ж Хацежына звярнула ўвагу на тое, што пасля заканчэння індывідуальнага будаўніцтва людзі не могуць засяліцца: няма адпаведных камунікацый, газу, вады.

— На прыёмы кожны чалавек ідзе са сваімі зваротамі. І задача ўлады адсачыць: дзе асабістыя, а дзе сістэмныя праблемы. Сёння жыхаркі аграгарадка Хацежына паднялі сур'ёзныя сістэмныя пытанні, якія ў цэлым характэрныя для Мінскага раёна: уладкаванне інфраструктуры, пад'язных дарог, газіфікацыі, водазабеспячэння, — пракаментаваў вынікі прыёму грамадзян Анатоль Ісачанка. — Мы над гэтай тэмай працуем. І, думаю, на наступны год будзем закладваць грошы для рашэння гэтых праблем. Магчыма, не 100 %, але ў большасці мы абавязаны з імі разабрацца.

А вось прыватныя зямельныя спрэчкі, канфлікты паміж суседзямі, на думку кіраўніка цэнтральнага рэгіёна, неабходна вырашаць індывідуальна, разбірацца, наколькі маюць пад сабой падставы ці хтосьці з бакоў кіруецца меркантыльнымі інтарэсамі. Трэба рабіць так, каб усім было добра.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Вышыні, якія давялося скарыць, каб стаць студэнтам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Працягваецца залічэнне на першы курс і ў Белдзяржуніверсітэце. Высокія балы на гуманітарныя спецыяльнасці нікога ўжо не здзіўляюць. А вось з авалоданнем фізікай у беларускіх школьнікаў назіраюцца ў апошнія гады сур'ёзныя прабелы. Тыя, хто добра здаюць гэтую дысцыпліну, часцей за ўсё выбіраюць спецыяльнасці ІТ-галіны. Але ж фізіка патрабуецца шмат дзе: і на інжынерных спецыяльнасцях, і ў педагагічных універсітэтах, і на фізфаку ў БДУ.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сёлета на спецыяльнасці фізічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта па аб'яднаным конкурсе былі залічаны 150 абітурыентаў. Прахадны бал склаў 221 (у 2017 годзе — 244). На асобных спецыяльнасцях былі наступныя прахадныя балы: «камп'ютарная фізіка» — 285 (у 2017 годзе — 282); «ядзерная фізіка і тэхналогіі» — 265 (у 2017 годзе — 263); «фізіка» (кірунак — навукова-даследчая дзейнасць) — 232 (у 2017 годзе — 260); «фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій» — 238 (у 2017 годзе — 260); «фізіка» (кірунак — вытворчая дзейнасць)» — 245 (у 2017 годзе — 259); «фізіка» (кірунак — кіраўніцкая дзейнасць) — 221 (у 2017 годзе — 257).

У Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава па агульным з фізічным факультэтам конкурсе былі залічаны на спецыяльнасць «медыцынская фізіка» 15 чалавек і столькі ж — на спецыяльнасць «ядзерная і радыяцыйная бяспека». Прахадны бал склаў усяго 195 (летась — 244).

А вось на хімічным і біялагічным факультэтах назіраецца больш аптымістычная сітуацыя. На спецыяльнасці хімфака залічаны 150 абітурыентаў, сярод іх 20 чалавек прыняты без экзаменаў. На групу спецыяльнасцяў па аб'яднаным конкурсе прахадны бал склаў 287 (у 2017 годзе — 313). На асобныя спецыяльнасці прахадныя балы былі наступныя: «хімія» (кірунак — фармацэўтычная дзейнасць) — 343 (столькі ж і летась); «фундаментальная хімія» — 343 (у 2017 годзе — 350); «хімія» (кірунак — навукова-вытворчая дзейнасць) — 326 (у 2017 годзе — 323); «хімія высокіх энергій» — 315 (у 2017 годзе — 313); «хімія» (кірунак — ахова навакольнага асяроддзя) — 287 (у 2017 годзе 314); «хімія» (кірунак — навукова-педагагічная дзейнасць) — 311 (у 2017 годзе — 313).

А самы высокі прахадны бал (356) быў зафіксаваны на спецыяльнасці «хімія лекавых злучэнняў». Відавочна, што перспектыва стварэння лекаў прывабліве шмат маладых людзей, як, дарэчы, і біятэхналогіі.

На біялагічным факультэце па аб'яднаным конкурсе залічана 160 абітурыентаў, сярод іх 32 без экзаменаў. Прахадны бал — 308 (у 2017 годзе — 284). Прахадныя балы на асобных спецыяльнасцях склаліся наступныя: «біялогія» (кірунак — біятэхналогія) — 323 (у 2017 годзе — 309); «біяхімія» — 321 (у 2017 годзе — 313); «мікрабіялогія» — 314 (у 2017 годзе — 300); «біялогія» (кірунак — навукова-вытворчая дзейнасць)» — 308 (у 2017 годзе — 291); «біяэкалогія» — 308 (у 2017 годзе — 284).

У БНТУ адкрытае залічэнне адбудзецца 27 ліпеня. Але ўжо вядома, што самы высокі конкурс на дзённую бюджэтную форму навучання — 8 чалавек на месца — быў зарэгістраваны на факультэце маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва.

Максімальныя заяўленыя ў прыёмную камісію балы сёлета на энергетычным факультэце, дзе абітурыент набраў 377 балаў з 400 магчымых, факультэце тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі (368), факультэце інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі (368) і аўтатрактарным факультэце (366).

У Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце прахадныя балы па факультэтах па агульным конкурсе склалі ад 280 да 375. У студэнты залічаны 44 абітурыенты, якія набралі 380 і больш балаў, у тым ліку восем будучых першакурснікаў маюць бал 390 і больш.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЕСНІ ДЛЯ ЕЎРАПЕЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ ПРАГУЧАЦЬ У БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІІ

Пяць музычных кампазіцый будуць прадстаўлены ў другім туры конкурсу на стварэнне песень для цырымоній адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Мерапрыемства адбудзецца 26 ліпеня ў малой зале Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі.

На конкурс, абвешчаны Міністэрствам культуры, паступіла 18 заявак, у тым ліку з Беларусі, Малдовы, Аргенціны і Японіі. Матэрыялы праслухоўвала журы пад старшынствам народнага артыста Беларусі Васіля Раінчыка. У склад экспертаў таксама ўвайшлі вядомыя беларускія выканаўцы, кампазітары, прадстаўнікі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года», Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Міністэрства спорту і турызму, Мінкультуры, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

Па выніках праслухоўвання вызначана пяць кампазіцый, максімальна адпаведных тэматыцы мерапрыемства, якія адрозніваюцца высокім мастацкім узроўнем, сучаснасцю гучання і падачы музычнага матэрыялу: «Winners», «Champion», «Bright year, bright you», «Хто, калі не мы» і «This land».

— *Для цырымоній адкрыцця і закрыцця трэба мноства рознахарактарных музычных кампазіцый,* — расказаў **менеджар па цырымоніях і культурнай праграме фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Сяргей ХОМІЧ.** — *Для цырымоніі адкрыцця неабходна больш пафасная музыка, для цырымоніі закрыцця — музыка з інтанацыямі суму. У абедзвюх цырымоніях будуць і энергічныя мелодыі ў маладзёжным спартыўным рытме. Таму казаць, што выбіраецца нейкая адна кампазіцыя, няправільна. Цяпер у журы ёсць магчымасць выбраць тыпы музычных кампазіцый для розных мэт, якія могуць быць па-рознаму выкарыстаны, напрыклад, для якога-небудзь мастацкага эпізоду ўнутры цырымоній адкрыцця і закрыцця або падчас дыскатэкі, якая правадзіцца для спартсменаў і валанцёраў у канцы цырымоніі закрыцця.*

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп прапанаваў ЕС адмовіцца ад пошлін

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прапанаваў Еўрасаюзу адмовіцца ад усіх пошлін і гандлёвых бар'ераў. Аб гэтым кіраўнік Злучаных Штатаў напісаў у «Твітэры». Прэзідэнт ЗША адзначыў, што прадстаўнікі Еўрасаюза прыедуць у Вашынгтон, каб абмеркаваць умовы гандлю. «У мяне ёсць для іх ідэя. І ЗША, і ЕС адмаўляюцца ад усіх пошлін, бар'ераў і субсідый! Гэта, нарэшце, можна будзе назваць свабодным рынкам і сумленным гандлем! Спадзяюся, што яны гэта зробяць. Мы гатовыя, а яны — не!» — напісаў Трамп. Раней стала вядома, што ЗША выдзеляць $12 млрд фермерам з-за гандлёвай вайны.

Мэй узначаліць перагаворы з ЕС па брэксіце

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй узначаліць брытанскі бок на перагаворах з Еўрасаюзам па пытанні брэксіту. Пра гэта яна паведаміла ў сваім пісьмовым звароце да парламента Злучанага Каралеўства, інфармуе тэлеканал Sky News. Мэй падкрэсліла, што міністэрства па пытаннях брэксіту працягне займацца ўнутраным парадкам дня і весці падрыхтоўку да выхаду краіны з ЕС, у тым ліку па сцэнарыі, які выключае заключэнне здзелкі з Бруселем. Перагаворы па брэксіту павінны працягнуцца да лістапада 2018 года, пасля чаго дасягнутую здзелку павінны ўхваліць Еўрапарламент і Вестмінстэр. Сам брэксіт пройдзе 29 сакавіка 2019-га, пасля чаго, згодна з планам, павінен наступіць пераходны перыяд, які будзе доўжыцца да 31 снежня 2020 года.

На мундзіялі больш за ўсіх патраціліся амерыканцы

Спажывецкі рынак Расіі ў перыяд правядзення чэмпіянату свету па футболе паказаў істотны рост у асноўных турыстычных сегментах — на рынку гатэляў і арэнды жылля, а таксама ў сегменце рэстаранаў-кафэ. Аб гэтым піша часопіс «Эксперт» са спасылкай на ацэнку «Ашчадбанка». Агульныя выдаткі замежнікаў у еўрапейскай частцы Расіі падчас чэмпіянату склалі каля $ 1,5 млрд. Турысты з ЗША выдаткавалі ў Расіі 5,6 млрд рублёў. На другім месцы Кітай — 4,1 млрд рублёў. Выдаткі па картах з Мексікі склалі 2,2 мільярда рублёў, Вялікабрытаніі — 1,9 млрд рублёў. Каля 1 млрд рублёў патрацілі заўзятары з Аргенціны, Германіі і Бразіліі. Самыя папулярныя артыкулы выдаткаў: гатэлі (5 млрд рублёў), рэстараны (4,3 млрд рублёў) і авіяпералёты (1,4 млрд рублёў).

■ Спажывец

ЧАМУ ДАРАЖЭЕ КУРАЦІНА?

Антыманапольнае міністэрства разгледзела ў гэтым прыкметы цэнавай змовы

У ходзе маніторынгу цэнавай сітуацыі ў чэрвені — ліпені эксперты заўважылі, што цэны на мяса птушкі істотна выраслі. Прычым рост адбыўся за кошт цаны вытворцаў. Пры тых жа гандлёвых надбаўках вытворцы павялічылі цану і адмянілі зніжкі, якія былі раней. Па асобных гандлёвых аб'ектах цана на мяса птушкі вырасла да 28 %. Такім чынам аднамомантава сябе павялі найбуйнейшыя вытворцы птушкі. Астатнія, якія не займаюць істотнай долі на рынку, падцягнуліся за лідарамі і паднялі кошты прыкладна на такім жа ўзроўні. Гэта факт. Мы папрасілі пракаментаваць сітуацыю прадстаўніка зацікаўленага ведамства.

— Папярэдне мы не выявілі эканамічных падстаў для аднамомантавага росту цэн на мяса птушкі. Праводзіцца расследаванне, калі будуць вынікі, мы паведамім, — сказаў **начальнік аналітычнага ўпраўлення Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) Павел ФІЛІПАЎ.** — У рэгіёнах зафіксаваны значны рост цэн на мяса курыцы з адменай усіх скідак, пры гэтым фактару сезоннасці выяўлена не было. Мяса курыцы падаражэла ў сярэднім на 12—15 %: павышэнне адпускной цаны на 6—7 % плюс адмена зніжак дае такі істотны рост. Гэта было заўважана спажыўцамі.

Акрамя таго, начальнік упраўлення заўважыў, што зафіксаванае ўзняцце цэн вытворцамі мяса птушкі на адну велічыню адбылося практычна ў адзін дзень. «Не могуць вырасці выдаткі прадпрыемстваў на вытворчасць птушкі адначасова ў адзін дзень. Гэта працяглы працэс. Бачацца прыкметы цэнавай змовы», — паведаміў Павел Філіпаў.

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў прадстаўнікоў міністэрства, ці магчымае ў хуткім часе «адкручванне» неабгрунтавана паднятых коштаў.

Як растлумачыла **начальнік юрыдычнага ўпраўлення міністэрства Таццяна ПАРЭЙКА,** аналагічная сітуацыя з аднамомантным ростам цэн была зафіксавана раней у сферы сувязі. «Як толькі прайшла інфармацыя пра пачатак антыманапольнага расследавання, суб'екты змянілі сітуацыю і вярнуліся да таго, што было раней», — дадала яна.

Таксама на прэс-канферэнцыі журналісты паднялі пытанне пра перабоі з пастаўкамі цэменту і пра падаражанне гэтага будаўнічага матэрыялу. **Намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ** лічыць, што дэфіцыту цэменту ў нашай краіне ў цяперашні час няма.

Ён заявіў, што праблемы з пастаўкамі цэменту на ўнутраны рынак раней былі выкліканы часовым спыненнем вытворчасці ў ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» з-за паломкі. «Чэрвень быў вельмі гарачы, вялікі попыт быў на цэмент з-за таго, што будматэрыял хутка высыхаў. Калі пры дрэнным надвор'і яму трэба тры дні, то ў спякоту ён высыхаў за дзень. Таму падняўся ажыятажны попыт на цэмент, у некаторых месцах ён штучна падаграваўся», — сказаў першы намеснік міністра.

Паводле яго слоў, пытанне аб пастаўках цэменту абмяркоўвалася ва ўрадзе на ўзроўні віцэ-прэм'ера Анатоля Калініна. Прадпрыемствы, як запэўнілі прадстаўнікі Мінбудархітэктуры, былі дастаткова забяспечаны запасамі цэменту да сезона.

Былі часовыя праблемы з продажам цэменту ў рознічнай гандлёвай сетцы. «Адзначаліся пэўныя факты яго адсутнасці. Гэта звязана з непланамернай адгрузкай з заводаў. Надвор'е сапсавалася і ажыятажны попыт на яго знік», — удакладніў Артур Карповіч.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Падрабязнасці

БЯЗВІЗ НА МЕСЯЦ

Тэрмін бязвізавага знаходжання ў нашай краіне замежных грамадзян павялічаны да 30 дзён. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 ліпеня. Пры гэтым правілы прыбыцця засталіся тыя ж: іншаземцы павінны прылятаць праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Ігар ФІСЕНКА, начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС, адзначыў, што за апошнія тры гады ва ўрэгуляванні рэжыму ўезду замежнікаў адбыліся значныя пазітыўныя змяненні. Колькасць іншаземцаў, якія наведалі нашу краіну, істотна павялічылася. Асноўная доля ўязджае праз Нацыянальны аэрапорт. Пасажырапаток праз яго толькі летась павялічыўся на 20 %. Сёлета рост працягваецца.

Бязвізавы ўезд адбіўся і на рэгіёнах. Рост экспарту турыстычных паслуг на Гродзеншчыне па выніках 2017-га павялічыўся на 34 % да ўзроўню 2016-га. У Мінску — на 35,5 %. Чакаецца, што змяненні прывядуць да далейшага развіцця турыстычнай сферы. Перш за ўсё гэта датычыцца даступнасці санаторнага і медыцынскага турызму, бо тэрмін пуцёўкі цяпер укладваецца ў гэтыя 30 дзён. Таксама гэта дазваляе вырашыць пытанні з уездам балельшчыкаў, якія збіраюцца наведаць міжнародныя спартыўныя мерапрыемствы, і падрыхтоўкай спартсменаў на вучэбна-трэніровачных зборах. Што датычыцца медыцынскіх паслуг, па словах **Дзмітрыя КАЛІСТРАТАВА, начальніка ўпраўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, цэнаўтварэння і дзяржаўнай маёмасці Міністэрства аховы здароўя,** чакаецца, што сёлета аб'ём экспарту медыцынскіх паслуг павялічыцца на 15—20 % (і складзе каля $40 млн).

Андрэй МОЛЧАН, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму, падкрэсліў, што павелічэнне тэрміна бязвізавага ўезду прывядзе да павелічэння якасці і культуры абслугоўвання. У тым ліку неабходна пашыраць выкарыстанне асноўных замежных моў і навучаць персанал у рэгіёнах. Ужо існуюць і новыя прапановы па лібералізацыі знаходжання турыстаў у нашай краіне. **Вадзім ЗАБАРОНАК, начальнік аддзела міграцыі дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў,** расказаў, што падрыхтаваны законапраект, у якім прадугледжваецца павялічыць тэрмін знаходжання іншаземцаў без рэгістрацыі да 10 дзён. Акрамя таго, працягваецца работа па ўвядзенні рэгістрацыі праз адзіны партал электронных паслуг, гэта значыць праз інтэрнэт.

Надзея АНІСОВІЧ

■

■ Супрацоўніцтва

АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ПАГРОЗЫ

Стартавала Міжнародная школа па падрыхтоўцы да рэагавання на надзвычайныя сітуацыі

Арганізатарам мерапрыемства выступіла Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Падобнае навучанне праходзіць ужо сёмы раз. Школа будзе доўжыцца да 29 ліпеня. Заняткі праходзяць на базе Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі МНС у Барысаўскім раёне.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, генеральны сакратар БТЧК Вольга МЫЧКО.**

— Мэта школы — адпрацаваць механізмы ўзаемадзеяння і каардынацыі валанцёрскіх атрадаў БТЧК з зацікаўленымі дзяржаўнымі, міжнароднымі і грамадскімі арганізацыямі ва ўмовах прыбыцця ў краіну вялікага ліку вымушаных перасяленцаў і мігрантаў, — падкрэсліла Вольга Мычко.

Сёлета на тэрыторыі Беларусі сабраліся каманды нацыянальных таварыстваў Чырвонага Крыжа з 10 краін, сярод якіх Балгарыя, Латвія, Літва, Расія, Таджыкістан, Украіна. Дарэчы, прадстаўнікам апошняй прыйшлося прайсці жорсткі конкурсны адбор: з 400 ахвотных адабралі ўсяго 10 чалавек. Упершыню да мерапрыемства далучыліся валанцёры з Ірана.

У праграме школы — практычныя трэнінгі, накіраваныя на выратаванне ў цяжкадаступных месцах і завалах, аказанне першай дапамогі вялікай колькасці пацярпелых, адпрацоўка алгарытму дзеянняў пры хімічных і радыяцыйных аварыях. Кульмінацыяй стануць 24-гадзінныя палявыя вучэнні. Згодна з легендай, камандам неабходна арганізаваць пункты часовага размяшчэння і транзітныя лагеры для вялікай колькасці вымушаных перасяленцаў на фоне шматлікіх дарожных аварый і крызісных сітуацый.

У рабоце школы задзейнічаны прадстаўнікі Міжнароднай федэрацыі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, МНС, МУС, Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, Фонду ААН у галіне народанасельніцтва, упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў ААН, Фонду ААН у галіне народанасельніцтва. З іх удзелам пройдзе семінар па пытаннях арганізацыі дапамогі вымушаным перасяленцам і мігрантам ва ўмовах сучасных выклікаў.

Дар'я КАСКО

■

ЗА КРОК АД ТРАГЕДЫІ

Пяцігадовая дзяўчынка ў Гомелі, якая была адна дома, выйшла на балкон дзявятага паверха і стала ў расчыненым акне. Нераўнадушныя мінакі выклікалі ратавальнікаў.

Выпадак адбыўся на вуліцы Кожара ўвечары ў аўторак. Адзін ратавальнік падняўся на дзявяты паверх і ўбачыў, што ўваходныя дзверы ў кватэру зачынены. Тады ён пачаў наладжваць кантакт з дзяўчынкай праз дзверы. У нейкі момант яна адышла ад расчыненага акна. Тут жа ў кватэру па аўталесвіцы праз акно трапіў другі ратавальнік.

Аб тым, што здарылася, супрацоўнікі МНС тут жа паведамілі маці. Аказалася, што яна, выходзячы з дома, папрасіла паглядзець за дзяўчынкай і дзевяцігадовым хлопчыкам сваю старэйшую сястру. Але яна таксама некуды пайшла. А пасля пайшоў гуляць і хлопчык. «Ланцужок» адказных скончыўся — і так малая засталася дома адна.

Ратавальнікі дачакаліся прыходу маці.

— Кожны выпадак, калі дзеці застаюцца без нагляду дарослых, мы расцэньваем як надзвычайную сітуацыю, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік ведамства Віталь НАВІЦКІ.**

Нагадаем, што 9 ліпеня трагедыя па аналагічным сцэнарыі ледзь не разыгралася ў Мінску: пяцігадовы хлопчык, які таксама быў адзін дома, вываліўся з акна сёмага паверха. Малога паспелі злавіць у коўдру, ад падзення ён атрымаў траўмы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Запрашальнік

СПОРТ І ШОУ Ў АДНЫМ ФЛАКОНЕ

Спаборніцтвы па конным спорце прыме Ратамка

З 26 да 29 ліпеня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы пройдзе турнір па міжнародным конным трохбор'і. Чакаецца, што ў спаборніцтвах прыме ўдзел больш за 80 спартсменаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Эстоніі, Казахстана, а таксама Літвы і Польшчы.

Каманда гаспадароў будзе прадстаўлена наймацнейшым складам, таму што турнір катэгорыі трох зорак дазваляе праверыць магчымасці як наезнікаў, так і коней. *«Збяром усіх наймацнейшых, каб зарабіць рэйтынгавыя ачкі і пазмагацца ў 2019 годзе за ліцэнзію ў камандным трохбор'і на Алімпійскія гульні ў Токіа. У нас ёсць высокія шанцы. Галоўнымі канкурэнтамі будуць сапернікі з Расіі і Польшчы»,* — адзначыў **удзельнік Алімпійскіх гульняў у Лондане, адзін з лідараў беларускай каманды Аляксандр ФАМІНОЎ.**

Коннае трохбор'е ўключае ў сябе тры дысцыпліны: манежную язду, крос і пераадоленне перашкод. Гэты від спорту лічыцца самым відовішчным, але ў той жа час небяспечным, частыя падзенні коней могуць пацягнуць сур'ёзныя наступствы, таму траса для спаборніцтваў будзе рыхтавацца вельмі старанна.

У цэлым адзначым, што ў беларускага коннага спорту багатыя традыцыі. Нашы спартсмены прымалі ўдзел у пяці Алімпіядах. Цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка да наступных галоўных стартаў чатырохгоддзя ў Японіі. *«Стараемся аказваць усялякую дапамогу нашым лідарам. З'явілася дастатковая колькасць коней высокага ўзроўню, якія могуць канкураваць на міжнароднай арэне. Маючы адбыцца турнір па трохбор'і ў Ратамцы раскрые магчымасці нашых коней і наезнікаў»,* — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі коннага спорту Сяргей ДРАЖЫН.**

У выхадныя 28 і 29 ліпеня на час адкрытага чэмпіянату Беларусі распрацавана праграма для гледачоў, на тэрыторыі комплексу будуць арганізаваны фуд-корты, дзіцячая зона, прапрацоўваюцца маршруты дастаўкі заўзятараў у Ратамку.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■

■ Наш фармат

ВЫСОЦКІ І СУЧАСНІКІ

Пад Навагрудкам адбыўся пяты бардаўскі фестываль

Каля возера Літоўка пад Навагрудкам прайшоў рэгіянальны фестываль-конкурс бардаўскай песні «Музыка сэрцаў», які пяты раз сабраў прыхільнікаў творчасці савецкага паэта, акцёра і аўтара-выканаўцы ўласных песень Уладзіміра Высоцкага.

Як адзначылі ў аддзеле культуры Навагрудскага райвыканкама, удзел у конкурсе сёлета ўзяло больш за 20 аўтараў і выканаўцаў з розных рэгіёнаў. Таксама падчас фестывалю працавалі кніжная ілюстратыўная выстава «Чалавек, паэт, акцёр» і фотавыстава «Навагрудак у 60-я».

А яшчэ проста на беразе возера на вялізным экране адбыўся начны кінасеанс фільма «Сыны ідуць у бой» Віктара Турава. Паводле мастацкай легенды, Уладзімір Высоцкі, які ў 1969 годзе падчас здымак у фільме жыў у Навагрудку разам з жонкай Марынай Уладзі, за адну толькі ноч напісаў некалькі песень для карціны, а пазней пад уражаннем ад гісторыі і прыгажосці тутэйшага краю стварыў большасць песень са свайго ваеннага цыкла.

Вікторыя ЗАХАРАВА

■

ЛІЛЕІ ДЛЯ НАФТАГРАДА

Да такога прызнання ў любові да роднага горада далучаецца кожны жыхар Наваполацка.

Ёсць людзі шчаслівых прафесій. Аднясём да іх і тых, хто выконвае «просценькую» справу — трымае нашы гарады ў чысціні і парадку, а па сутнасці, штодзённа і нястомна ўпрыгожвае іх. Не адзін год мы знаёмы з Юрыем ШЫПКІНЫМ, кіраўніком Наваполацкай спецаўтабазы, і ведаем, што менавіта так расцэньвае ён уласны занятак і занятак сваіх калег.

Кіраўнік Наваполацкай спецаўтабазы Юрый ШЫПКІН.

— Сапраўдным экзаменам на прафесійную сталасць для калектыву была падрыхтоўка да нядаўняга святкавання 60-годдзя Наваполацка, — расказвае Юрый Аляксандравіч. — Здаецца, рабілі ўсё як звычайна: даглядалі вуліцы і тратуары, высаджвалі кветкі і дрэвы, але ўся наша работа была гэтым разам як бы падарункам роднаму гораду да яго свята. А значыць, выконвалася як ніколі адказна, якасна.

Напружанне, калі рыхтаваліся да юбілею, было значнае. Гэта як падчас любога мерапрыемства, што патрабуе поўнай аддачы сіл і аптымальнай арганізацыі, без дзялення на дробязі і на важнае. Дробязяў у нашай справе не бывае. Тым больш што мы чакалі прадстаўнікоў гарадоў-пабрацімаў, у выніку і прыехалі адразу 20 дэлегацый. Былі госці і з розных раёнаў краіны.

Вы не ўпершыню ў нашым горадзе, але сёння на яго вуліцах убачыце нямала для сябе цікавага. Мы імкнуліся, каб паўсюдна былі прыкметы свята, якія б стваралі адпаведны настрой у насельніцтва і гасцей Наваполацка, і каб яны засталіся надоўга.

Гідам журналістаў «Звязды» па горадзе стаў **галоўны інжынер Ігар КУДРЫН**. У гэтую прафесію людзі прыходзяць рознымі шляхамі. Ігар Алегавіч закончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут, працоўную біяграфію пачынаў у гарадской жыллёва-камунальнай гаспадарцы, тут вырас да начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела. Пасля рэарганізацыі з ЖКГ вывелі шэраг калектываў, у тым ліку спецаўтабазу, яны набылі юрыдычную самастойнасць. Атрымаўшы ў гэты «пераходны перыяд» досвед работы ў будаўнічай арганізацыі, Кудрын тры гады таму прыйшоў у спецаўтагаспадарку галоўным інжынерам.

— Мне падабаецца ўдзельнічаць у паўсядзённай рабоце па добраўпарадкаванні і азеляненні буйнога індустрыяльнага цэнтра, — кажа галоўны інжынер. — Прыемна бачыць прыкметныя вынікі працы свайго калектыву — пра іх гаварылі нам і ўдзельнікі святочных мерапрыемстваў.

Пытаемся ў суразмоўніка: а што было найбольш складаным падчас падрыхтоўкі — наводзіць парадак на гарадскіх вуліцах ці яшчэ больш упрыгожваць іх?

— Не цяжка ні адно, ні другое, калі займаешся гэтым пастаянна, і калектыў прывык, ведае сваю справу. Канешне, былі і складанасці, не без таго. Стараліся вырашаць іх аператыўна. Калектыў наш моцны, і ўсе перажываюць за горад, усім хочацца, каб ён быў прыгожы. Адносімся да горада як да ўласнага дома. Калектыў — не маленькі, 350 чалавек, і ва ўсіх такая настроенасць — на чысціню, на парадак. Мы абслугоўваем Наваполацк, пасёлак Баравуху і новы для нас мікрараён Міжрэчча. Нядаўна перадалі яго нам, раней гэта была тэрыторыя адказнасці «Нафтана». Ён не праблемны, мы прынялі на сябе дарогі, вуліцы, яны і раней былі дагледжаныя. Наша задача — падтрымліваць іх у такім жа добрым стане.

— Вось будуецца дзясяты мікрараён, — працягвае Кудрын. — Як бачыце, тут прыгожыя дамы рознай паверхавасці і рознай каляровай гамы, архітэктары імкнуцца надаць раёну свой твар. Будаўнікі яшчэ працуюць, і мы імкнёмся знаходзіць з імі агульную мову, каб не расцягвалі зямлю з новабудоўлі па вуліцах.

Галоўны бухгалтар Кацярына АСТАШКЕВІЧ і галоўны інжынер Ігар КУДРЫН.

— У галоўнага інжынера сваёй, скажам так, «інжынернай» работы хапае?

— Мы не дзелім работу на сваю і не сваю, у нас узаемазамяняльнасць, але чыста інжынернай работы хапае, бо тэхнічная ўзброенасць нармальная. Да Дня горада набылі два маленькія «Беларусы» з навясным абсталяваннем, для работы як у зімовую пару, калі яны будуць вельмі запатрабаваныя на ачыстцы тратуараў ад снегу, так і летам. Сёння ім хопіць работы з навяснымі касілкамі. Займелі ўстаноўку «Тайфун» для ямачнага рамонту вуліц і тратуараў. Самае «вузкае» месца любога горада менавіта ямачны рамонт. Абнаўляем аўтамабільны парк. Ёсць і МАЗы, і самазвалы-«цяжкавагавікі», спецыяльная свідравальна-кранавая ўстаноўка, двухсекцыйны паліваззапраўшчык. У планах новыя закупкі — у прыватнасці, прыгожага і зручнага аўтамабіля «Газель. Next» для перавозкі рабочых. Перадавой эфектыўнай тэхнікай пры падтрымцы гарвыканкама аснашчаемся пастаянна.

— А зараз мы знаходзімся з вамі паблізу цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Маякоўскага, — працягвае свой расказ наш гід. — Якраз тут устаноўлены флагштокі са сцягамі гарадоў-пабрацімаў, новыя лавачкі. Падсаджвалі загадзя маладыя дрэўцы, бачыце, як яны выстраіліся радамі? З цягам часу падрастуць, зазелянеюць і будзе вельмі прыгожа.

Побач, на вуліцы Паркавай, заасфальтавалі дарогу, паднавілі дарожкі, таксама лаўкі паставілі, ліхтары, а дзе спатрэбілася — змянціравалі агароджу. Нашы партнёры з водаканала аднавілі работу гарадскіх фантанаў, і ў выніку атрымалася яшчэ адно прывабнае месца для адпачынку гараджан. Каля такіх найбольш прыкметных месцаў жыхары і госці Наваполацка пастаянна фатаграфуюцца.

Наш горад вырастаў не на старых «касцях», тут няма прыватнага сектара з праблемнымі кварталамі, якія трэба зносіць. Тым не менш жылыя раёны патрабуюць увагі. Спознішся з-за таго, што не выдзелены своечасова сродкі ці проста не звярнулі ўвагу, і назаўтра сродкаў спатрэбіцца значна больш.

Вы пытаецеся пра расаду кветак — яе ў асноўным вырошчваем ва ўласнай цяплічнай гаспадарцы і часткова закупляем, бо расады патрэбна нямала. Адны клумбы адцвілі, кветкі на іх абляцелі, і нашы працавітыя дзяўчаты высаджваюць сюды новыя. За гэтым стаіць карпатлівая работа, у тым ліку зімой, калі «музычнымі» жаночымі пальчыкамі патрэбна пікіраваць тысячы (!) саджанцаў кветачак.

Працуе наш участак гарсвятла. Хлопцы падтрымліваюць і рамантуюць лініі вонкавага асвятлення, замяняюць свяцільнікі на энергазберагальныя, святлодыёдныя. Горад расце, і асвятляем новыя ўчасткі, якія раней не былі падключаны. Задача эканоміі электраэнергіі вырашаецца з дапамогай шафаў кіравання — аўтаматыка сама павышае ці паніжае напружанне, а значыць, і асветленасць на вуліцах.

Нават вялікая металічная канструкцыя сімвала горада — лілеі — абвешана эканомнымі святлодыёднымі лямпачкамі. Святочнымі вечарамі гіганцкая лілея глядзіцца вельмі эфектна, гараджане ацанілі, таксама любяць тут фатаграфавацца. Сэлфі атрымліваюцца не горшымі і на фоне шматлікіх яркіх клумбаў, і на фоне канструкцыі «Я ♥ Наваполацк»...

Цікавімся ў суразмоўніка, хто складае эскізы кветкавых кампазіцый для афармлення горада.

Жанчыны, якія «патанаюць» у моры кветак, — работніцы Ніна ФІЛІМОНЧЫК і Ніна ПРЫГАЖАЕВА.

Аказваецца, свае ж спецыялісты з участка зялёнага будаўніцтва, які ўзначальвае знаёмая нам па мінулай камандзіроўцы Таццяна Герліц. Укладваюць у іх не толькі ўласнае бачанне прынцыпаў «зялёнай прыгажосці», але і душу. Дарэчы, Таццяна паспела абараніць кандыдацкую дысертацыю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на тэму «Перспектыўны асартымент дэкаратыўных кветкавых раслін для паўночнага рэгіёна Рэспублікі Беларусь».

Творчаму падыходу Таццяны і яе дзяўчат можна давяраць хоць бы таму, што на конкурсах зялёнага будаўніцтва, якія праходзяць у рамках абласных свят «Дажынак», іх кампазіцыі штогод займаюць прызавыя месцы.

Дзякуючы клопатам брыгад спецаўтабазы дагледжана і цэнтральная плошча, яна і зараз выглядае па-святочнаму, строга і ўрачыста. І бульвар на вуліцы Кірава, які носіць імя Льва Наважылава, ды і іншыя знакавыя мясціны горада, пералічваць можна доўга. А ў паркавай зоне чакаецца сапраўдная падзея — побач з атракцыёнамі будуецца дзіцячы гульнявы комплекс. Там будуць не толькі гульні, але і спартыўныя пляцоўкі, і трэнажоры — на любы густ. Дзеці змогуць на свежым паветры спакойна «ганяць» на веласіпедах, на роліках. Побач ужо дзейнічае спартыўна-гульнявы комплекс для дарослых, узведзены на сродкі спонсараў, так што ёсць чым заняцца і бацькам. Цікава, што спартыўныя трэнажоры закупілі ў так званым антывандальным выкананні. Год эксплуатацыі прайшоў, яны ніколі не прастойваюць, і да гэтага часу ніхто нічога не зламаў. Што сведчыць не толькі пра трываласць жалеза, але і пра паважлівыя адносіны гараджан да агульнай маёмасці.

Участак зяленага будаўніцтва выконвае таксама заказы прадпрыемстваў і арганізацый па высадцы кветак на іх тэрыторыях. У навапалачан ёсць такое вось агульнае жаданне — жыць прыгожа. І гэта трэба разумець. Нікому не адмаўляюць, такія заказы выконваюцца з асаблівым задавальненнем. Прыгажосць, разлітая на вуліцах горада, пашыраецца, знаходзіць свой працяг.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 391487274.

Радок з біяграфіі Наваполацка ўвасоблены ўмелымі рукамі дызайнераў-азеляніцеляў.

Газоны на вуліцах Наваполацка заўжды дагледжаныя.

Пад зялёнымі шатамі для дзятвы пабудавалі казачную вясковую сядзібу.

Сямейная газета

Выпуск № 14 (105)

ПАДЛОГУ МЫЦЬ НЕ ТРЭБА...

Свет з'ехаў з глузду. У Амерыцы з'явіліся кампаніі, якія прапаноўваюць абдымкі... за грошы. Падобная паслуга каштуе ў сярэднім 100 долараў за гадзіну. Заказаў, як ні дзіўна, паступае тысячы. Сярод кліентаў: людзі, у якіх праблемы з сацыялізацыяй у грамадстве, якія не маюць часу на адносіны, пакутуюць на дэпрэсію...

Калі доўга заседжваюся ў працоўным кабінеце, у мяне, як правіла, пачынаецца дэпрэсія. Праглядаю навіны ў інтэрнэце, вычытваю чужыя матэрыялы, перыядычна праводзячы поглядам праз акно людзей, якія кудысьці спяшаюцца, — а на душы адчуванне, што жыццё праходзіць міма. Адно выратаванне ў такім выпадку — тэрмінова ехаць у камандзіроўку, пажадана ў вёску.

Дзе яшчэ, як не ў вёсцы, цябе сустрэнуць, як сваю, зусім незнаёмыя людзі. Пры гэтым не пашкадуюць цэлага дня, каб паказаць і расказаць усё, што можа зацікавіць сталічную госцю. Бясплатна пагодзяцца навучыць усяму таму, што самі ўмеюць — пракідваць чаўнок, вышываць процягам, ляпіць збаны з гліны... Прыдумаюць адмыслова да твайго прыезду «свята першага агурка». І нават спаць пакладуць, калі ты (захапіўшыся размовай) не паспяваеш на цягнік. З сённяшняй гераіняй — Ларысай Рыжковай — мы таксама расставаліся як даўнія сяброўкі, з абдымкамі. Па дарозе дадому погляд спыніўся на кабачку з яе невялічкага агародзіка, які вызіраў з заплечніка. І ў гэты момант я злавіла сябе на думцы, што той офіснай дэпрэсіі і след прастыў.

Калі вам таксама цяжка дыхаць у горадзе і ёсць некалькі дзён вольнага часу, раю таксама паехаць у вёску. Напрыклад, у Любкі, што на Вілейшчыне, да сям'і Палюшыных, якая загарэлася ідэяй узнавіць сядзібу сваіх дзядоў. «Мой прадзед Міхась ездзіў зарабляць грошы ў Амерыку, каб пабудаваць хату, якая з цягам часу абрасла і клеццю, і стайняй, і пуняй, і токам, і лазняй... — піша на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках Вольга Палюшына. — Больш за 20 гадоў тут стала ніхто не жыў. І вось мне захацелася ўдыхнуць у Любкі новае жыццё, каб сюды ехалі турысты, — вярнуць сядзібу прадзеда да адаптаванай аўтэнтыкі. А ў гаспадарчых пабудовах зладзіць невялічкія экспазіцыі. Балазе захавалася шмат гаспадарчага рыштунку, мэбля, калядныя кажухі. Мне дапамагае мая сям'я. Але працы столькі, што ўчора аж заплакала ад роспачы, калі пачала ачышчаць рэшткі васьмі слаёў шпалераў з дрэва 1912 года... Сябры, патрэбна ваша дапамога! З нас за валанцёрства — незабыўны адпачынак на вёсцы: няспешны тэмп жыцця, птушкі, гамак у садзе, дуб, Нарачанка, ягады-грыбы... Магчыма, вы знойдзеце тут нешта сваё...»

Я захапляюся Воляй і яе сям'ёй. Гэтаксама, як і сваімі знаёмымі, якія ў нашу сайдынгавую эпоху не купляюць фабрычныя гармонікі ды гуслі. А едуць у вёску ў пошуках аўтэнтычных або робяць іх самі. Колькі папсуюць матэрыялу, пакуль навучацца, разгадаюць сакрэт нашых продкаў. Тым не менш не апускаюць рукі, не ідуць простым шляхам. Хочуць сапраўднага, бо стаміліся ад падробак.

Не ведаю, як у вас, а ў мяне таксама з узростам усё больш і больш душа прагне сапраўднага. Маладзенькай жоўтай бульбінкі з хрумсткім агурочкам з бацькоўскага агарода замест чыпсаў ці піцы. Душэўных пасядзелак з дарагімі сэрцу людзьмі за гарбаткай замест шумнай дыскатэкі... Шчырых бясплатных абдымкаў замест тысячы дзяжурных слоў выключна дзеля ветлівасці...

На днях у сеціве прачытала цудоўную параду. «Калі ў вядро з вадой дадаць 30 кропель эфірнага алею піхты і памыць падлогу, то дома будзе, як у лесе». А знізу цудоўны каментарый да яе: «Кіньце дурное і ідзіце ў лес. Там таксама пахне, як у лесе, і падлогу мыць не трэба».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Сустрэча без абцасаў

Ларыса РЫЖКОВА:

«НІЗАВОШТА НЕ ПРАМЯНЯЮ ВЁСКУ НА ГОРАД»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Менавіта вось гэты здымачак Анатоля Клешчука, на які любуюся з пачатку года са звяздоўскага насценнага календара, і натхніў мяне на сустрэчу без абцасаў з Ларысай РЫЖКОВАЙ.

З першай секунды адчула сябе ў Міханавічах, быццам у гасцях у бабулі. І ўсё дзякуючы непадробнай вясковай гасціннасці кіраўніцы ўзорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка». Адмыслова да майго прыезду спадарыня Ларыса спякла сваю фірмовую шарлотку. «Ведалі б вы, як дзеці (мае на ўвазе «калыханкаўцаў») любяць мае пірагі ды наліснічкі... Як напяку на Масленіцу вялікі стос бліноў, за вушы не адцягнуць».

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

■ Спрэчны момант

ВЫХАВАННЕ ПА РАСКЛАДЗЕ

Жанчына скардзіцца, што былы муж не дае ёй сустракацца з дачкой

Калі бацькі разводзяцца, то ў пераважнай большасці выпадкаў суд пакідае дзіця з маці. Гісторыя Ганны* не з іх ліку. Яе дзевяцігадовая дачка жыве з бацькам. З маці дзяўчынка праводзіць час па графіку, устаноўленым судом. Але сустракацца па раскладзе не заўсёды ўдаецца: Ганна кажа, што не бачыць дачку месяцамі, бо былы муж чыніць перашкоды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Трэба было маму слухаць»

З будучым мужам Ганну пазнаёміла сяброўка. Павел папрасіў нумар тэлефона, прапанаваў прагуляцца. Ганна, тады 18-гадовая вясковая дзяўчына, якая толькі прыехала ў Мінск, была ўсцешана такой увагай з боку мужчыны (Павел старэйшы за яе амаль на 20 гадоў).

Праз паўтара года яны пабраліся шлюбам, потым нарадзілася дачка.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

* *Усе імёны зменены з этычных прычын.*

■ З жыцця

СПАГНАННЕ АЛІМЕНТАЎ, ПЕРАСЛЕДАВАННЕ І СЕКСІСЦКАЯ РЭКЛАМА

Якія яшчэ пытанні хвалююць нашых жанчын?

За два гады дзейнасці інфармацыйна-прававой лініі Цэнтра па прасоўванні правоў жанчын «Яе правы» яго юрысты дапамаглі абараніць інтарэсы 618 жанчын і апрацаваць больш як 900 запытаў ад іх.

У цэнтры канстатуюць: калі яшчэ паўгода таму назіраўся значны рост зваротаў, звязаных з дыскрымінацыяй у працоўнай сферы (каля 16 % ад усіх зваротаў), то зараз гэты паказчык зноў знізіўся да 10 % ад усіх зваротаў. На гэтым фоне істотна ўзрасла колькасць зваротаў, звязаных з парушэннем правоў у сямейна-бытавой і сацыяльнай сферах — 53,7 % і 14,1 % адпаведна.

Заўважана, што тэматыка зваротаў моцна карэлюе з інфармацыйнымі паведамленнямі, якія з'яўляюцца ў СМІ. Напрыклад, колькасць спецыфічных зваротаў на лінію прапарцыянальна вырастала пасля з'яўлення тэматычных публікацый у медыя аб дыскрымінацыі ў працоўнай сферы або аб неправамерным аднясенні сем'яў у катэгорыю «сацыяльна небяспечнае становішча».

Усё гэтак жа шмат прыходзіць запытаў у сямейна-бытавой сферы па дзецях і аліментах — за год колькасць зваротаў павялічыліся з 38 % да 42,5 %. Жанчын даводзіцца кансультаваць, пачынаючы ад тлумачэння ім паслядоўнасці дзеянняў з іх боку, да таго, як яшчэ можна паспрабаваць спагнаць аліменты з бацькі-неплацельшчыка, калі ўсе магчымыя спосабы ўжо прыменены. У 9 з 10 выпадкаў кліенткі інфармацыйна-прававой лініі скардзяцца, што мужчыны хаваюць свае даходы. І пакуль у гэтай сітуацыі цяжка нешта зрабіць: муж можа плаціць усяго па капейцы ў месяц і гэта будзе лічыцца ўжо дастатковай спробай яго ўдзелу ў жыцці дзіцяці. Бегаючы ад інстанцыі да інстанцыі і спрабуючы даказаць, што ў мужчыны ёсць крыніцы даходаў, якія ён проста хавае, жанчына сутыкаецца з бяздзейнасцю, «адфутбольваннем» у іншыя ўстановы, з нізкай зацікаўленасцю чыноўнікаў у вырашэнні падобных праблем. Калі ж мужчына ў прынцыпе не плаціць аліменты, то дзейнае заканадаўства мае на ўвазе яго пакаранне за нявыплату (пазбаўленнем волі ці папраўчымі работамі), але ніяк не тое, каб ён іх заплаціў.

Акрамя гэтага, жанчыны сутыкаюцца з сітуацыяй, калі неспаганыя аліменты з'яўляюцца для іх перашкодай у атрыманні адраснай сацыяльнай дапамогі: каб атрымаць дапамогу, трэба спагнаць аліменты. А каб спагнаць аліменты, трэба ўстанавіць бацькоўства праз суд, заказваючы дарагую экспертызу, на якую ў большасці кліентак проста няма сродкаў. Атрымліваецца замкнёнае кола.

У шэрагу выпадкаў вырашэнне сітуацыі пагаршаецца фінансавай незабяспечанасцю, неабароненасцю і ўразлівасцю жанчыны: адсутнасцю сродкаў на аплату адваката, арэнду жылля, на зварот у суд для падзелу маёмасці, скасавання шлюбу, спагнання па камунальных плацяжах і г. д. Плюс мае месца нізкая прававая інфармаванасць жанчын.

Юрысты цэнтра працягваюць фіксаваць павелічэнне колькасці зваротаў па сітуацыях пераследавання з боку былога мужа ці партнёра (прыкладна ўдвая). Але паколькі ў беларускім заканадаўстве не прадугледжана абарона ад пераследавання, а факт хуліганства адсутнічае, зрабіць штосьці досыць складана.

Таксама на інфармацыйна-прававую лінію працягваюць паступаць звароты па факце выяўлення прыкмет сексісцкай рэкламы — штомесяц фіксуецца па некалькі такіх зваротаў. У сувязі з гэтым цэнтрам быў распрацаваны тыпавы зварот у адпаведныя інстанцыі, які можна самастойна дапрацаваць у адпаведнасці з канкрэтным выпадкам. Але да гэтага часу ў нас афіцыйна не замацавана паняцце «сексісцкая рэклама», таму даводзіцца кожны раз трактаваць такую рэкламу як неэтычную (п. 3 ст. 26 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе»).

За два гады арганізацыя падрыхтавала і накіравала каля 10 калектыўных зваротаў у розныя структуры, аб'ядноўваючы тэматычныя звароты ў адзін шэраг, па такіх тэмах, як сексісцкая рэклама, рэпрадуктыўныя правы жанчын, сацыяльна небяспечнае становішча, хатні гвалт і іншых.

У цэлым за два гады дзейнасці цэнтру ўдалося не толькі дапамагчы жанчынам абараняць іх правы, але і прасунуць гэту тэму наперад па многіх напрамках на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Юрысты канстатуюць, што «работа ў полі» дае самую каштоўную інфармацыю пра тое, якія існуюць перашкоды на шляху да рэалізацыі жанчынамі іх правоў і з якой дыскрымінацыяй сутыкаюцца беларускі. Праз непасрэдную камунікацыю з жанчынамі юрысты бачаць, як працуе ці не працуе закон, чаго ў заканадаўстве не хапае альбо што трэба змяніць.

Звярнуцца па дапамогу ў цэнтр «Яе правы» можна з панядзелка па чацвер з 09.00 да 17.00 па тэлефонах:

(8 017) 327-77-27, velcom (029) 635-56-62, МТС (033) 675-56-62

Таксама гэта можна зрабіць па электроннай пошце help@eeprava.by

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Цэнтр па прасоўванні правоў жанчын «Яе правы» — беларуская некамерцыйная арганізацыя, асноўная мэта якой — аказанне бясплатнай і канфідэнцыяльнай інфармацыйна-прававой дапамогі дзяўчатам і жанчынам, якія сутыкнуліся з парушэннем іх правоў у сувязі з дыскрымінацыяй па прыкмеце полу. У ім можна атрымаць інфармацыю юрыдычнага характару, рэкамендацыі, як дзейнічаць у канкрэтнай сітуацыі, а таксама дапамогу па складанні іскавых заяў, хадайніцтваў і наступным суправаджэнні справы.

■ Дзяржава гарантуе

ЗНОЎ ПРА ЛЬГОТЫ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

Мінпрацы падзялілася самай свежай інфармацыяй

Наша дзяржава зацікаўлена ў тым, каб нараджалася як мага больш дзяцей, таму стараецца стымуляваць нараджэнне другога дзіцяці, а таксама праводзіць палітыку падтрымкі шматдзетных сем'яў. Нагадаем, што сям'я набывае статус шматдзетнай ужо пры нараджэнні трэцяга дзіцяці, і з гэтага моманту мае шэраг ільгот і гарантый. Больш падрабязна пра іх, а таксама пра дадатковыя прэферэнцыі пры з'яўленні ў сям'і чацвёртага і пятага дзіцяці нам расказала намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі Марына АРЦЁМЕНКА.

Статус шматдзетнай сям'і пацвярджаецца пасведчаннем шматдзетнай сям'і, якое выдаецца пры нараджэнні трэцяга дзіцяці і пры наяўнасці ў жывых астатніх дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

Для шматдзетных сем'яў прадугледжаны наступныя асноўныя льготы і гарантыі:

— налічэнне сямейнага капіталу (на дзяцей, народжаных (усыноўленых, удачароных) трэцімі і наступнымі ў перыяд з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года);

— налічэнне стандартнага падатковага выліку ў павышаным памеры (па 57 рублёў у месяц на кожнае дзіця) па месцы працы бацькоў;

— льгота па падатку на нерухомасць і па зямельным падатку;

— зніжэнне аплаты на 50 % за карыстанне падручнікамі дзецьмі-школьнікамі;

— зніжэнне аплаты на 50 % за харчаванне дзіцяці ў дашкольнай установе;

— налічэнне скідкі са сфарміраванага кошту навучання ў дзяржаўных установах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

— забеспячэнне навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі бясплатным харчаваннем;

— льгота па аплаце паслуг электра- і газазабеспячэння;

— па месцы працы даецца дадатковы свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны;

— шматдзетным сем'ям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аказваецца дзяржаўная падтрымка на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Так, субсідыя на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдыту, выдадзенаму на гэтыя мэты, даецца шматдзетным сем'ям у наступных памерах: пры наяўнасці траіх непаўналетніх дзяцей — у памеры 95 працэнтаў ад сумы асноўнага доўгу па крэдыце; пры наяўнасці чацвярых і больш непаўналетніх дзяцей — у памеры 100 працэнтаў ад сумы асноўнага доўгу па крэдыце.

Акрамя таго...

Калі ў сям'і нарадзілася пяць і больш дзяцей, то для маці прадугледжаны яшчэ дадатковыя гарантыі.

Гэта прызначэнне датэрміновай пенсіі па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту на пяць гадоў для маці, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей да 8-гадовага ўзросту. Без патрабаванняў па пенсійным узросце такія пенсіі прызначаюцца шматдзетным маці, якія працуюць у арганізацыях сельскай гаспадаркі непасрэдна ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Пры неабходнасці больш падрабязныя тлумачэнні могуць быць атрыманы ва ўпраўленні мясцовага органа ўлады па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Таксама ўзнагароджанне ордэнам Маці (з выплатай у памеры пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва) за нараджэнне і выхаванне пяцярых і больш дзяцей, пры дасягненні пятым дзіцем узросту аднаго года — па прадстаўленні мясцовых органаў улады, аблвыканкама. Гэты пункт датычыцца тых маці, якія забяспечваюць належнае ўтрыманне і выхаванне дзяцей.

Святлана БУСЬКО

■

ВЫХАВАННЕ ПА РАСКЛАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Яго сям'я не хацела дзіця, казалі, што не ад яго. Мяне заўсёды гнабілі за тое, што я вясковая, у мяне няма маёмасці, бацькі звычайныя заводскія рабочыя, — успамінае жанчына. — Трэба было маму слухаць, калі яна папярэджвала. Я ж вучобу кінула дзеля мужа. Бо на дзённым вучылася, а ён паставіў умову: хочаш добра адзявацца і есці — ідзі працуй. Сваім дзецям заўсёды буду паўтараць: калі мама кажа не выходзіць замуж за гэтага чалавека, лепш паслухацца.

Сямейнае жыццё не складвалася. Калі дачцэ Веры споўнілася тры, пара развялася. Ганна то здымала аднапакаёўку, то вярталася на кватэру да мужа: той часта быў у раз'ездах, таму бачыліся рэдка. Пытання наконт выхавання дачкі не ўзнікала. Пакуль Павел не вырашыў зноў ажаніцца. Суд пастанавіў, што малой лепш будзе ў таты — у мамы, у адрозненні ад яго, на той момант не было ні мінскай прапіскі, ні ўласнага жылля ў сталіцы.

Год таму Ганна выйшла замуж. Кватэрнае пытанне вырашылася, але рашэнне суда засталося нязменным. І хоць у законе прапісана, што пасля разводу бацькі маюць роўныя правы на ўдзел у выхаванні дзіцяці, для жанчыны незразумела: як дачку маглі не пакінуць з ёй?

— Я не алкагалічка, да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці ніколі не прыцягвалася. Так, у мяне менш квадратных метраў, але ж жыллё ёсць. Я працавала касірам, прыносіла даведку з работы з даходамі. Паказвала графік, што у мяне пяцідзённа, што я паспяваю дзіця адвесці ў садок і забраць, усе выхадныя магу праводзіць з ім. Ёсць усе ўмовы, і ўсё роўна суд не на маім баку. Чаму так? За што нармальных мам пазбаўляюць дзяцей? Я ўсю цяжарнасць з жыватом прабегала па судах (месяц таму Ганна нарадзіла другую дачку. — **Аўт.**). Мне суддзя казаў: «Вы ў цяжары, сядзелі б дома». А як я магу кінуць сваё дзіця?

«Дзіця настроілі супраць»

Суд вызначыў парадак удзелу Ганны ў выхаванні дачкі. Так, жанчына можа забіраць малую да сябе на выхадныя з начлегам два разы на месяц, кожны аўторак бачыцца з ёй з 14 да 18 гадзін, другі і чацвёрты чацвер з 17 да 20 гадзін — без прысутнасці бацькі дзяўчынкі і з правам наведваць культурна-адукацыйныя, забаўляльныя, спартыўныя і аздараўленчыя мерапрыемствы. Плюс маці «аддалі» некаторыя святы, зімовыя канікулы і месяц летніх. Але, па словах Ганны, праблема ў тым, што Павел гэта рашэнне суда не выконвае і перашкаджае сустрэчам: не адказвае на званкі, не адчыняе дзверы кватэры.

— Да прыставаў звяртаюся, там ужо стос маіх скаргаў — нічога не робяць. Ніхто не хоча лезці ў сямейныя справы. Паўла, можа, баяцца. Дзіця ён настроіў супраць мяне: калі размаўляю з дачкой, чую ў трубцы, як ёй падказваюць, што гаварыць. Вера з айчымам не можа пазнаёміцца — кожны раз, калі я прыязджала з ім, дзверы мне ніхто не адчыняў.

Па рашэнні суда Ганна мае права вывозіць дачку летам на аздараўленне, у тым ліку і за межы краіны. Спачатку жанчына думала паехаць з малой у бацькоўскі вясковы дом, што стаіць на рэчцы, ці да цяперашняй свекрыві на Віцебшчыну, на азёры. А потым сястра прапанавала адправіцца на мора. Але, дзеліцца суразмоўніца, былы муж Веру з ёй не адпускае.

Ганна запэўнівае, што аліменты яна плаціць спраўна. Плюс купляе дачцэ адзенне, прадукты.

— Прыносіла фрукты. Мяса не набывала: дачка адбіўныя не есць. Яна любіць катлеткі, але я ведаю, што ніхто ёй гатаваць гэтага не будзе. На дзень нараджэння да дачкі ехалі з сястрой, падарункаў накупілі. Ролікі, мікраскоп, розныя сумачкі, кветкі. Вера любіць цюльпаны, як і я: толькі мне падабаюцца жоўтыя, а ёй фіялетавыя.

На роліках, уздыхае Ганна, малая так і не каталася. «Проста яе ніхто не вучыць. У яе няма дзяцінства, як у звычайных дзяцей, нават сябровак. Раней пойдзеш з дачкой у двор — на цэлы дзень, бегае з дзяўчаткамі. А цяпер мне суседзі кажуць, што Вера сядзіць дома або з дзедам выходзіць на вуліцу — ён курыць, яна на лавачцы сядзіць. Дачка сама нічога не расказвае, забаранілі. Паводзіць сябе так, як ёй загадалі. Яна баіцца тату. Я сама яго баялася, калі жылі разам. Не магла слова сказаць, запярэчыць, бо ведала, што прыбіць можа».

Турбуе жанчыну і тое, што малая не ходзіць у школу — яна на дамашнім навучанні.

— Толькі на першым званку была, і ўсё. Яна не ведае, што такое калектыў, урокі. Мне, як маці, такое не падабаецца.

«Дзяўчынка сама не хоча»

Павел званком журналістаў быў шакаваны, але пагадзіўся растлумачыць сітуацыю са свайго боку. Мужчына запэўнівае, што бачыцца малой з маці не забараняе, пакідае іх сам-насам і на адпачынак таксама гатовы адпусціць. Але дзяўчынка сама не хоча.

— Яна хаваецца, плача. Што я, насільна пасаджу яе ў машыну і скажу «едзь»? Гэта ж не немаўля. Дачцэ ўжо 9 гадоў, яна лагічна мысліць, у яе ёсць сваё бачанне сітуацыі, яна ў праве сама вырашаць. Хто можа яе прымусіць, абавязаць? — дзеліцца Павел.

— Чаму Вера не хоча бачыцца з мамай?

— Напэўна, мама вінаватая. Яна ў свой час зрабіла ўсё, каб дзіця адпіхнуць. Гуляла, кідала дачку па начах. Яна ёй псіхалагічную траўму нанесла. А калі забірала Веру ў бацькоўскі дом, дачка там моцна хварэла. Тэмпература была пад 40, а Ганна нават не выклікала «хуткую», не лячыла малую. Дзіця мне само ўсё расказвала.

У матэрыялах суда ёсць псіхалагічнае заключэнне сацыяльна-педагагічнага цэнтра аднаго з раёнаў Мінска. Там напісана, што прывязанасць дзяўчынкі да маці носіць неналежны характар. «У адносінах да маці ў Веры выяўлена негатыўнае стаўленне, якое сведчыць аб наяўнасці эмацыянальных праблем у адносінах з ёй». (Праўда, па словах Ганны, дачку апытвалі ў прысутнасці бацькі, што магло паўплываць на яе адказы.)

Мужчына прызнаецца: раней у яго не так шмат часу было, каб дачцэ ўвагу ўдзяляць, на працы прападаў. Але цяпер графік больш вольны, і ён можа займацца выхаваннем Веры.

— Са мной яна цудоўна жыве, развіваецца, вучыцца. Я засцерагаю дачку ад негатыву, яна не ведае ніводнага мацернага слова. Чаму на дамашнім навучанні? Мы так вырашылі, бо ў яе ёсць іншая занятасць, яна ў вакальнай школе займаецца.

Павел дадае, што бясконцыя судовыя пасяджэнні яго ўжо стамілі.

— Я разумею Ганну як маці. Але, мне здаецца, яна не ўлічвае інтарэсы дзіцяці — якая ж тут любоў? Яе мэта — скрасці мір з нашай сям'і. Адна справа, калі б дачцэ тут дрэнна было, але ж не. У нас выхаваная, інтэлігентная сям'я. У мяне цудоўная жонка, якая дапамагае. У нас усё выдатна, паверце.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

❍ **Каментуе адвакат Ірына ШЭЛЕГ:**

— Калі пасля разводу адзін з бацькоў перашкаджае іншаму сустракацца з дзіцем у час, устаноўлены судом, трэба звяртацца ў аддзел прымусовага выканання раёна з заявай аб прыцягненні былога мужа ці жонкі да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне рашэння суда. Выканаўцы мусяць пракантраляваць, ці мае месца парушэнне. Калі, напрыклад, бацька кажа, што не аддасць дзіця, адсутнічае дома без уважлівай прычыны ў час, калі маці павінна забраць малога, — гэта невыкананне з прамым намерам. Але, бывае, што чалавек у водпуску ці захварэў — такія сітуацыі не будуць лічыцца прамым намерам, і правапарушэння тут не будзе.

У кожным канкрэтным выпадку ёсць нюансы. Гэта пытанне бывае складана вырашыць. Часам дзіця спецыяльна аддаюць на гурткі і секцыі, дзе заняткі супадаюць з тым часам, які выдзелілі камусьці з бацькоў. Нядобрасумленныя людзі рознае прыдумваюць. Не буду расказваць пра ўсе варыянты, каб гэта не ўспрынялі як інструкцыю да дзеяння.

Што датычыцца адукацыі дзіцяці, то па законе гэта пытанне вырашаецца па згодзе між бацькамі. Я яшчэ не чула, каб такія спрэчкі разглядалі ў судзе. Але, калі ў аднаго з былых сужэнцаў ёсць прэтэнзія да арганізацыі навучання сына ці дачкі, трэба звяртацца са скаргай ва ўпраўленне адукацыі.

■ Нататкі шматдзетнага таткі

ПАХУДАЛЬНЫ КАКТЭЙЛЬ

Сядзім на прысядзібным участку, дзеці корпаюцца ў зямлі. Пытаюся ў іх:

— Дзеці, што вы там усё капаеце?

— Мы хаваем камара.

— Якога камара?

— Якога Вера забіла.

— А хаваеце нашто?

— Дык ён жа памёр.

Гэта была рубрыка «Гарадскія дзеці выехалі на прыроду».

☺ ☺ ☺

Жаночая логіка. Старэйшая дачка:

— Тата, ты мяне любіш?

— Так.

— А калі я цябе папрашу сёння ўвечары не глядзець футбол, ты не будзеш глядзець?

— Буду.

— Вось як ты, татачка, выконваеш свае абяцанні.

☺ ☺ ☺

— Нам за канікулы сказалі вывучыць па геаграфіі назвы ўсіх прыліваў і адліваў.

— А хіба ў прыліваў і адліваў бываюць назвы?

— Вядома! Ты што не ведаў?

— Ану прачытай, што ў дзённіку запісана.

Дачка прынесла дзённік, чытае:

— Вывучыць назвы ўсіх праліваў і заліваў.

— Ну вось бачыш.

— Што «бачыш»? А я што сказала?

— Ты сказала: прыліваў і адліваў.

— Ну падумаеш, пераблытала крыху.

P. S. А наогул, шкада, што ў прыліваў і адліваў не бывае назваў. Трэба было б іх неяк назваць таксама, каб дзецям было чым заняцца на канікулах.

☺ ☺ ☺

Старэйшая дачка шуміць на кухні міксерам. Пытаюся ў яе:

— Што ты там такое робіш?

— Пахудальны кактэйль.

— Каля адзінаццатай ночы?

— Проста есці захацелася.

Чым добры пахудальны кактэйль, дык гэта тым, што яго можна піць у любы час дня і ночы і пры гэтым усё роўна худнець.

☺ ☺ ☺

Чарговы раз канфіскаваў у сына ўсе яго гаджэты. Ён традыцыйна нараканаў, але на ўсе ягоныя нараканні я сказаў:

— Нічога, у нас у дзяцінстве гаджэтаў не было — і ніхто не памёр.

Ён падумаў-падумаў і кажа:

— Затое ў вас быў Савецкі Саюз!

Дарэчы, так. Мала таго, што ў нас не было гаджэтаў, дык у нас яшчэ і Савецкі Саюз быў.

Увогуле, выгнаў яго на вуліцу гуляць у футбол — каб усё як у Савецкім Саюзе.

☺ ☺ ☺

Малодшыя:

— Тата, а адкуль бяруцца грошы?

— З чароўнай скрыні.

— З якой яшчэ скрыні?

— Хадзем пакажу.

Падыходзім да найбліжэйшага банкамата. Непрыкметна ўстаўляю картку, уводжу код і кажу:

— А ну ж, чароўная скрыня, выдай нам сто рублёў на кішэнныя выдаткі.

Скрыня пачынае шумець (тыпу думае) і выдае пачак дробных купюр.

Я, прадчуваючы трыумф:

— Ну як?

Вера:

— Тата, мы цябе спыталі, адкуль бяруцца грошы, а ты прывёў нас да звычайнага банкамата.

☺ ☺ ☺

З жыцця двайнятак. Вера:

— Мне сёння цёця ў краме падарыла каляндарык! *(Паказвае.)*

— А Полі?

— Полі не падарыла.

— Чаму?

— Бо яна падумала, што гэта зноў я.

☺ ☺ ☺

Малодшыя дзеці прынеслі некалькі манет і сказалі:

— Тата, а гэта ў нас шмат грошыкаў?

— Калі шчыра, не вельмі. Усяго дзесяць капеек.

— А можаш нам дадаць, каб стаў рубель? А то мы збіраем на марозіва.

— Магу, вядома.

Жонка:

— Вы лепш раскажыце тату, як даўно вы збіраеце. Толькі што папрасілі ў мяне дзесяць капеек, а цяпер просяць крыху дадаць да рубля.

P. S. Па-мойму, за вынаходлівасць можна і дадаць. Хоць гэта і стварае небяспечны прэцэдэнт.

☺ ☺ ☺

Падарылі двайняткам на дзень нараджэння тэлефоны і навушнікі. Яны ўключылі музыку: ходзяць, слухаюць. Потым Поля прыходзіць:

— Тата, а чаму ў навушніках музыку чуваць горш, чым без навушнікаў?

Адказваю пытаннем на пытанне:

— А ты штэкер ад навушнікаў у тэлефон устаўляць не спрабавала?

І, галоўнае, ходзіць такая, слухае, і ўсе ў кватэры слухаюць разам з ёй.

P. S. Сучасныя дзеці прывыклі да бесправадных дэвайсаў, драты іх бянтэжаць.

Павел ХОЛАД

■

АД ВОПРАТКІ ДА ДУХОЎНАСЦІ

Першы ў Беларусі глянцавы часопіс для дзяцей і бацькоў прапануе вучыцца разам і адкрываць таленты

Яшчэ нядаўна новы часопіс «ДОМІК» нельга было знайсці ў газетных шапіках, але з ліпеня ўжо ёсць магчымасць аформіць падпіску і праверыць на свой густ, што прапануе айчынны глянец сучасным падлеткам. А каб гэты выбар быў свядомы, «Звязда» папрасіла рэдактара часопіса Анастасію РАДЗІКЕВІЧ правесці экскурсію па старонках выдання і расказаць, каго і чым яно можа зацікавіць.

— Мы доўга выношвалі ідэю часопіса для падлеткаў, уклаўшы сэнс у кожную літару. «ДОМІК» — гэта па-руску Дзеці, Адзенне, Мода, Мастацтва і Кнігі, — адзначае Анастасія Віктараўна. — Мы пастараліся максімальна прадумаць стратэгію і стварыць нешта, чаго яшчэ няма ў Беларусі. На выхадзе ж атрымалася нешта такое, чаго яшчэ няма ў свеце: з аднаго боку, мы падтрымліваем якасны фармат глянцу, а з другога боку — часопіс, арыентаваны не на забавы, а на духоўнае развіццё і эстэтычнае выхаванне. Спачатку разлічвалі на аўдыторыю 8+, але паступова прыйшлі да лічбы 12+, і, напэўна, на ёй і спынімся. Чаму вагаліся з лічбамі? Бо для 6-8-гадовых дзяцей усё ж цікавыя больш лёгкія тэмы: разнастайныя анкеты, казачныя героі, а падлеткам і іх бацькам будуць карысныя рубрыкі па доглядзе за сабой, па падборы гардэробу, па прыняцці сябе і ўсталяванні асабістай прасторы, інтэрв'ю з педагогамі — кіраўнікамі дзіцячых студый і г. д.

— Я «пратэсціравала» часопіс на ўласнай дачцэ. Як ні дзіўна, яна затрымала погляд не на прыгожых фотасесіях дзяцей-мадэляў, не на модным аглядзе, а на матэрыялах пра інклюзію, пра дзіцячыя творчыя гурткі, гістарычных замалёўках. Наколькі важныя для часопіса матэрыялы адукацыйнага, асветніцкага кшталту?

— Нам вельмі хочацца паказаць усё найлепшае, што ёсць у Беларусі. І гэта далёка не толькі дзіцячы мадэлінг, а перадусім таленавітыя дзеці і калектывы. Нягай яны будуць прадстаўленыя не на вокладцы часопіса, але ўнутры — абавязкова, пра іх трэба расказваць. Шмат увагі мы ўдзяляем і творчым конкурсам: адны арганізуем самі, у другіх удзельнічаем або падтрымліваем іх удзельнікаў і лаўрэатаў, каб іншыя дзеці таксама зацікавіліся і не толькі назіралі, а паспрабавалі самі заняцца чымсьці новым.

— З першага пілотнага выпуску мінула ўжо больш за паўгода. Якой была зваротная сувязь за гэты тэрмін, як ацанілі часопіс самі чытачы: мо, прапанавалі новыя рубрыкі або выказалі заўвагі?

— На сёння зваротная сувязь фарміруецца ў асноўным праз электронную пошту і сацыяльныя сеткі. Напрыклад, у Instagram без аніякай накруткі і рэкламы колькасць падпісчыкаў перавысіла 1000 чалавек. Пішуць бацькі і самі дзеці, і, напрыклад, менавіта з іх падачы змянілася калонка псіхолага — мама дваіх сыноў, бізнес-псіхолаг Вольга Паўлава-Сакалова, робіць не павярхоўную, тыповую для глянцу, рубрыку, а дае канкрэтныя і карысныя парады па сітуацыях, якія насамрэч хвалююць нашых дзяцей.

У нас наогул падабралася вельмі добрая каманда. Так, мне ўдалося ўгаварыць на гэты праект былога рэдактара часопіса «Горад жанчын» Марыю Сталярову, якая ведае, як рабіць часопіс і як рабіць PR. Учарашняя таленавітая студэнтка Эліна Сапожнікава стала рухавіком ідэй і выдатным шэф-рэдактарам — як мы жартуем, таму, што сама не так даўно была падлеткам і тонка адчувае аўдыторыю. У кожным нумары яна задае тон у «Словах рэдактара», якія заўжды ў тэму і да месца, а ў рубрыцы «Хэндмэйд» расказвае, як зрабіць прыгожыя рэчы сваімі рукамі. Мастак Дзіяна Каласовіч праводзіць захапляльныя экскурсіі ў свет жывапісу: расказвае пра розныя стылі, дапамагае лепш разабрацца ў мастацтве. Рубрыку «Кнігі» вядзе Таццяна Славінская-Пузырэвіч і робіць не проста падборку сучасных кніг, а такі грунтоўны і цікавы літаратурны агляд, што хочацца бегчы і проста зараз запоем прачытаць іх усе! Не выпадкова ў «ДОМІКу» адведзена два развароты на кніжныя рэцэнзіі — нам цікавыя дзеці, якія шмат чытаюць і гэтым робяць сабе выдатны інтэлектуальны падмурак на будучыню...

— Глянец — заўжды дарагая гісторыя, як для саміх выдаўцоў, так і для чытача. Нядаўна вы нарэшце атрымалі ўласны міжнародны код ISSN і падпісны індэкс. Колькі будзе каштаваць асобнік?

— 10 рублёў. Але, паверце, мы адпрацуем кожны рубель. Бо «ДОМІК» можна чытаць з вокладкі да апошняй старонкі, як добрую беларускую кнігу, выкарыстоўваць як навучальны дапаможнік па эстэтыцы і наогул духоўнаму развіццю, весці падшыўку, у якой і дзеці, і бацькі заўжды знойдуць шмат карыснага.

«З аднаго боку, мы падтрымліваем якасны фармат глянцу, а з другога боку — часопіс, арыентаваны не на забавы, а на духоўнае развіццё і эстэтычнае выхаванне».

— Заснавальнікамі часопіса выступілі мужчыны, а аўтары — пераважна дзяўчаты... Ці будуць з'яўляцца аўтары-мужчыны і больш «хлапечыя» тэмы, накшталт гаджэтаў, гіраскутараў, сучасных кірункаў спорту?

— Гіраскутары і гаджэты, дарэчы, у нас ужо былі, — смяецца Анастасія. — А мужчыны як сталі каля вытокаў часопіса, так і цяпер дапамагаюць яго рабіць, проста робяць гэта не навідавоку. Галоўны рэдактар «Вясёлкі» Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі ўвесь час побач, ён цвёрда трымае беларускую лінію і трапна заўважае, калі нейкіх тэм не хапае. Што да аўтараў... Складанасць нават не ў тым, каб знайсці мужчын-аўтараў (нам піша, напрыклад, вельмі цікавы аўтар з Расіі, і наогул часта мужчынскія матэрыялы адрозніваюцца большай глыбінёй і іншым, свежым падыходам), а ў тым, каб новы аўтар «трапіў» у агульны кірунак часопіса, здолеў узяць такія тэмы і расказаць іх такой мовай, каб гэта было цікава падлеткам. Мы, дарэчы, у пастаянным пошуку і заўжды адкрытыя да супрацоўніцтва: калі ласка, прыходзьце ў рэдакцыю, давайце знаёміцца і прыдумляць новыя рубрыкі!

— Ці ёсць сярод аўтараў самі дзеці?

— Я вам больш скажу: пры рэдакцыі створана дзіцячая рэдкалегія, якую ўзначальвае Злата Качэрва. А з верасня ў часопісе запланаваныя інтэрв'ю з папулярнымі беларусамі — выканаўцамі, артыстамі, спартсменамі, якія будуць рабіць самі дзеці. Першы, з кім ужо дамовіліся, — дзядзя Ваня: гэта добры прыклад паспяховага беларускага спевака, пры тым сем'яніна і бацькі, які адказна выхоўвае дзяўчынку. Мяркую, праект будзе цікавы і для дарослых, і для дзяцей. Падобны эксперымент мы ўжо рабілі: падчас дзіцячых дзён Беларускага тыдня моды замовілі асобна відэакамеру і фатографа, і дзеці спрабавалі браць інтэрв'ю ў дызайнераў, прычым гэта ў іх няблага атрымлівалася. Таксама ў верасні правядзём дадатковы кастынг дзяцей-вядучых, каб інтэрв'ю можна было не толькі надрукаваць, але і выкласці ў сацсетках і на інтэрнэт-сайтах. Безумоўна, у гэтай справе дзецям дапамагаюць бацькі, што вельмі добра, бо мы стараемся пазіцыянаваць часопіс якраз як сямейны, бо ёсць шэраг тэм, якія бацькі мусяць растлумачыць дзецям альбо скарыстаць ва ўласным бацькоўскім досведзе.

— Звярнула ўвагу, што частка матэрыялаў у часопісе — беларускамоўныя.

— І я спадзяюся, што іх доля павялічыцца да 40 %, заяўленых у канцэпцыі. Тут таксама запрашаем да супрацоўніцтва аўтараў — калі ў вас ёсць цікавыя тэксты на тэмы, прыдатныя для часопіса, калі ласка, дасылайце, будзем вельмі гэтаму рады. Ёсць толькі некалькі правілаў: матэрыял павінен быць цікавы, сучасны і адпаведны ўзросту аўдыторыі, на якую мы працуем. Але перадусім — цікавы, прычым не толькі нашаму рэдактару і карэктару, але і прыбіральшчыцы, якая часам дае пагартаць часопіс дзецям і ўнукам і пасля мае што сказаць на пэўныя тэмы.

— Чула, што ў верасні ў вас запланаваная вялікая прэзентацыя. Чаго чакаць цяперашнім і будучым чытачам?

— У верасні выйдзе, лічу, галоўны нумар года: яго аб'ём будзе павялічаны з 64 старонак да 86, прадставім усе праекты, якія не паспелі рэалізаваць за лета, падрабязна раскажам пра нашы студыі і гурткі, якія традыцыйна пачынаюць работу ў новым навучальным годзе. Плануецца новая рубрыка пад умоўнай назвай «Дзіцячыя мары»: раскажам аб тым, пра што марылі і кім хацелі стаць у дзяцінстве вядомыя беларусы — людзі, якія сёння ўжо дасягнулі пэўных поспехаў у жыцці і могуць служыць пэўным прыкладам для падлеткаў. Хоць, калі шчыра, я лічу, што дзіцячыя мары і памкненні любога чалавека цікавыя і вартыя ўвагі. Бо ў кожнага свой жыццёвы шлях, і важна прайсці яго з высока ўзнятай галавой і застацца чалавекам. Таму, спадары дарослыя, распытвайце сваіх дзяцей пра іхнія мары, адкрывайце ў іх новыя таленты (а неталенавітых дзяцей не бывае!) і хваліце за поспехі. Закамплексаваць дзяцей, прынізіць іх значнасць заўжды знойдуцца ахвотныя, але наша задача — падтрымаць і дапамагчы рэалізавацца.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«НІЗАВОШТА НЕ ПРАМЯНЯЮ ВЁСКУ НА ГОРАД»

ПРА ЗАГАДЧЫЦУ АЎТАКЛУБА, ВАЛЁНКІ Ў СНЕЗЕ ДЫ ЗАМОВУ АД ПАДХАЛІМСТВА

Я, як і большасць аднакурсніц *(Ларыса Рыжкова скончыла Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут. —* **Аўт.**), **марыла стаць знакамітай актрысай.** Кожныя канікулы праводзіла ў Ленінградзе. За 10 дзён паспявала паглядзець 20 спектакляў. Бачыла Фаіну Ранеўскую ды Расціслава Плята ў пастаноўцы «Далей — цішыня...», самога Высоцкага ў ролі Гамлета...

Мой муж, дарэчы, знешне быў падобны на Уладзіміра Высоцкага. Дачка і цяпер, калі бачыць акцёра па тэлевізары, кажа: «На тату нашага падобны».

Па размеркаванні трапіла ў Горкі. Пры сельгасакадэміі быў моцны дом культуры, але я, уся такая багемная, працягвала мроіць пра вялікую сцэну. Як толькі скончылася абавязковая адпрацоўка, паставіла маму перад фактам: «Еду ў Ленінград». Яна не пярэчыла. Відаць таму, што ў нас там было шмат радні. Два тыдні я шукала работу. Але не знайшла нічога акрамя мыйшчыцы і змазчыцы колаў у тралейбусным парку. Перш чым вярнуцца дадому, вырашыла праведаць сваячку, якая жыла ў Кірышах — гэта гарадок у Ленінградскай вобласці. Увечары за вячэрай мне яе муж кажа: «Лора, ну ты зайдзі да нас у аддзел культуры. Можа, там якая работа ёсць». Так я стала загадчыцай аўтаклуба. Вазіла лекцыі ды канцэрты па сёлах. Кіроўца аўтобуса ў выніку стаў маім мужам *(усміхаецца)*.

Мая цётачка — заслужаная артыстка Беларусі Ганна Рыжкова — папрасіла мяне пакінуць дзявочае прозвішча. У людзей творчых прафесій так было прынята. Муж жа мой быў чалавек просты. Усе дзіву даваліся, як я звязала з ім свой лёс. Мне ж у той час падабаліся людзі складаныя, творчыя. І раптам хлопец з хутара, піша з памылкамі... Я ж у ім сустрэла мужнасць: шмат было сітуацый, калі ён праявіў сябе, як сапраўдны мужчына. З сынам егера, я, гарадская дзяўчына, пазнала зусім невядомае дагэтуль жыццё. На лася разам з ім не раз паляваля ў загоншчыках. Ідзеш па снезе ў валёнках, правальваешся ледзь не па пояс... Экзотыка.

Калі нарадзіўся сынок, прыгадала ўсе казкі, якія калісьці чула. Пачынаю расказваць «жылі-былі дзед і баба...», малы імгненна заціхае. Дзіцятка, якое яшчэ не разумее слоў, слухае інтанацыю, яму цікава, куды ты голасам заплывеш. Гляджу — і свякроў са свёкрам прыціхлі. Нібы нешта робяць, а самі, адчуваю, хоць і не ведаюць беларускай мовы, таксама вушы навастрылі...

Мая цётачка ездзіла па ўсім Савецкім Саюзе і чытала са сцэны вершы беларускіх паэтаў. У прыватнасці, гумарныя замовы Ніла Гілевіча. «Каб не лізаў так часта / Ён роднаму начальству / Ні наскі, ні пяткі, / Ні ля пупа складкі, / ...Ні спераду забягаючы, / Ні збоку заглядаючы, / Ні ззаду даганяючы, / Ні знізу падпаўзаючы...» *(замова ад падхалімства)*. Паўсюдна на канцэртах беларуская мова з вуснаў Ганны Паўлаўны ўспрымалася на «ўра» і без перакладу. І ўсё гэта найперш таму, што была па-майстэрску інтанаваная.

ПРА ПЯЦЬ АВЕЧАК, ПАРТФЕЛЬ, ЯК У ЖВАНЕЦКАГА, ДЫ АЛЕРГІЧНЫ НАСМАРК

Аднойчы мне ўдалося завабіць у свой аўтаклуб Ігара Маціеўскага, фальклярыста з Ленінградскага інстытута тэатра, музыкі і кіно. Спачатку ён гадзіны дзве расказваў пра фальклор. А потым са свайго пацёртага, як у Жванецкага, партфеля дастаў пастухову дудачку і зайграў. Гэта быў сапраўдны цуд, я проста зап'янела ад гэтых расказаў і гукаў... У той момант зразумела, навошта лёс заслаў мяне ў Ленінградскую вобласць.

Неяк доктар сказаў мужу: «У вас алергічны насмарк. Вам трэба неадкладна памяняць клімат». А ў Кірышах у той час быў біяхімічны завод. Як на зло, і ў нашага дзіцяці пачаўся насмарк. Неяк ноччу ляжым у ложку, пра гэта размаўляем. Кажу мужу: «Толік, а можа паехалі ў Беларусь? А ён: «Паехалі». Так мы апынуліся ў Міханавічах. Праўда, на жаль, нядоўга ён пражыў удалечыні ад радзімы.

У Міханавічах ад нуды і дэпрэсіі мяне выратаваў фальклор. Я пачала ездзіць па бабульках, збіраць старажытныя беларускія песні, гульні, казкі. Потым мяне запрасілі працаваць на тэлебачанне. Гэта быў фальклорны цыкл праграмы «Калыханка», прысвечаны народным святам. Раз на месяц я надзявала народны строй і расказвала дзеткам нанач казкі і паданні пра Масленіцу, Саракі, Купалле. Першая мая «Калыханка» была калядная. «Ёсць, ёсць у Дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і Бабка-старушка. Дзед, о дзед! Падай Каляду!..» Як зараз памятаю, расказвала тады казку «Як воўк калядаваў». *(Цудоўна было б зараз вярнуць «Калыханку» ў такім фармаце. —* **Аўт.**). А чаму і не! Але нікому гэта чамусьці не прыходзіць у галаву.

Тая калядная «Калыханка» натхніла мяне на стварэнне сваёй «Калыханкі». Да канца масленічнага тыдня я ўжо сабрала ў сябе ў Міханавічах у пад'ездзе пяцёра дзяцей. Першай мы развучылі песню пра Масленіцу: «У нас сёння Масленіца. / Прыляцела ластавіца. / Села, упала на жэрдачку. / Шчабятала вестачку...» Спявалі тады яшчэ не вельмі чыста. «Нічога, — думала, — трэба ж з нечага пачынаць».

Ніколі не імкнулася выбіцца ў начальства. Гэта дало мне магчымасць застацца сабой. Каб я была дзе-небудзь у іншым месцы, мяне б паспрабавалі перарабіць, прымусілі скакаць пад чужую дудку. А тут, у Міханавічах, як я была дзівам, так дзівам і засталася. Мне галоўнае, каб народная песня жыла, каб не затухаў гэты агеньчык. Адчуваю адказнасць за гэта перад людзьмі ды перад Богам. Я сабе абрала гэты шлях, і большага шчасця мне не трэба.

БЛІЦ-АПЫТАНКА

— Калі б у вас была татуіроўка, што б на ёй было? Зараз, напрыклад, сярод моладзі папулярны беларускі арнамент.

— Я такія татуіроўкі раблю на сваіх фартухах, кашулях *(усміхаецца)*. Апошні раз вышыла сабе дубовыя лісточкі з жалудочкамі, а Каці (*спявае ў «Калыханцы».* — **Аўт.**) — курачку з пеўнікам як сімвал сям'і.

— Можа, у вас ёсць нейкі талент, пра які мала хто ведае?

— Люблю рамантаваць адзенне. Гэта мне і адпачынак, і настрой. Праўда, апошнім часам у асноўным вышываю, бо цыраваць цяперашняе пустая справа. Калі тая шкарпэтка пачала рвацца, то яе нічым не ўратуеш.

— Цікава, а пра што марыць казачніца?

— Улетку, калі мае «калыханкаўцы» раз'язджаюцца на канікулы і я адлучана ад сваёй асноўнай справы, пачынаю думаць пра казку. Што мне трэба паехаць у Маладзёжны тэатр эстрады і паказаць ім сваю казачную праграму. Няўжо гэта нікому не трэба?» ...Жыццё маё праходзіць. Я старэю. Хоць для казачніцы гэта не страшна *(смяецца)*.

Строі для «Калыханкі» шыю сама. У гэтым таксама ёсць мая свабода. Хочацца мне, напрыклад, вышыць гэту кветку, я яе вышываю. Мы з «Калыханкай» трымаемся стылістыкі магілёўскага касцюма. Колісь нас запрасілі на праграму «Крок». А нам не было чаго надзець. У цётачкі маёй была знаёмая бібліятэкарка ў Касцюковіцкім раёне. Кажа: «Няхай прыязджае твая пляменніца, я ёй тут мігам назбіраю касцюмаў». На наступны дзень я ўжо была ў Цеханічах. Бабулькі адразу ж мяне пазналі, бо я ж ужо была тэлевядучай, некалькі «Калыханак» правяла. Падаставалі з куфраў свае найлепшыя строі. Праўда, праз колькі год яны ў нас разваліліся, бо і так былі старэнькія, а яшчэ і мы іх пастаянна мылі ды прасавалі.

Шыць і вышываць мяне навучыла патрэба. Клала перад сабой тыя касцюковіцкія строі і расшыфроўвала крой, вышыўку. Мы, людзі, калі толькі захочам, дужа многа можам.

ПРА ДРЭННЫ ЗРОК, БЕЛАРУСКАМОЎНУЮ ЛІТУРГІЮ ДЫ СТАРОГА БАЦЬКУ

Мой тата — самавучка. Іграў на гітары, гармоніку, баяне, мандаліне... Раней людзі, што траплялася пад руку, усяму вучыліся. Паколькі ў таты быў дрэнны зрок, яго запрасілі акампаніятарам у клуб невідушчых. Ён дужа хораша спяваў. Калі госці збяруцца, ён маму абдыме і зацягне: «Я до войны спокойно жил с женой. / Мы оба с ней работали прилежно. / Она была всегда мила со мной. / И я к ней относился очень нежно...». Трэба заняцца неяк, аднавіць яго любімыя песні.

У свядомасці маіх «калыханкаўцаў» праз фальклор засяляецца цэлы кантынент — з гэтых коней, якія пасуцца ў полі, з дзяўчат, якія клічуць вясну ў сваё жыццё... У народных песнях столькі мудрасці! Яны дапамагаюць па жыцці, ускладняюць чалавека, робяць яго не аднамерным. На занятках мы развучваем таксама беларускія гульні ды казкі. Я цешуся: калі малыя вырастуць, ім будзе, што расказаць ды паказаць сваім дзецям.

Даўней быў такі звычай: як састарэюць бацькі, то дзеці вязуць іх у глухі лес ды і пакідаюць там... Адзін сын, каб яго не асудзілі суседзі, схаваў свайго нямоглага татку ў цёмнай каморцы. Аднойчы здарылася няшчасце: град усё жыта выбіў. Прыйшоў сын да бацькі ў каморку, бядуе. А той яму: «Пакуль я жывы, без хлеба мы не застанёмся. У тым годзе, калі мы гумно будавалі, быў вельмі добры ўраджай. Дык я немалочаным жытам страху накрыў. Здзяры яе, абмалаці і мецьмеш насенне». Сын так і зрабіў. Прыйшла зіма. Няма чаго есці. Зноў ідзе сын да бацькі ў цёмную каморку. «Вазьмі рыдлёўку ды пакапайся ў хаце пад лаваю, — кажа стары. — Там я некалі, як быў яшчэ малады, закапаў трохі грошай на чорны дзень. Абрадаваўся сын, выкапаў бацькавы грошы і купіў збожжа. Сам з сям'ёю хлеб есць ды яшчэ і суседзям пазычае. Вось яны і пытаюцца ў яго: «Адкуль ты хлеб бярэш?» Прызнаўся сын: «Бацька мяне корміць». Перасталі з таго часу сыны бацькоў у лес вазіць, а пачалі пад старасць шанаваць іх і даглядаць. Дык вось раней, калі якая бяда, усе па параду ішлі да бацькоў. Цяпер жа моладзь моліцца на камп'ютары ды банкаматы. І ад гэтага вельмі сумна.

Фальклярыстка Алена Боганева падарыла нам зборнічак духоўных вершаў, запісаных у Іванаўскім і Жыткавіцкім раёнах. Мы з дзецьмі развучылі іх і спяваем у Міханавіцкай царкве. Людзі, калі слухаюць, не могуць стрымаць слёз. А нядаўна нас папрасілі развучыць літургію на беларускай мове. Восенню прыходзьце паслухаць у мінскі сабор Пятра і Паўла.

Нізавошта не прамяняю вёску на горад. Тут яшчэ, дзякуй богу, ёсць простыя людзі. Ёсць мае суседкі, якія заўсёды гавораць тое, што думаюць. Гарадскі ж чалавек тысячу разоў падумае, што сказаць, і скажа, тое, што трэба. А мне дорага гэта адкрытасць, шчырасць. Кола яе ў сучасным свеце, на жаль, звужаецца. У Міханавічах яно пакуль ёсць, і я, дзякуй богу, магу ў ім знаходзіцца.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калыханка ад спадарыні Рыжковай

«Баю, баю, Несцерка, а на лета шэсцерка. / Баю, баю, Петрачок, а на лета сем дачок. / Баю, баю, малое, а на лета другое. / Адно будзе лялька, а другое нянька. / Адно будзем калыхаць, а другое забаўляць. / Пойдзе мамка ў асець і другое прынясець. / Баю, баю, Мішанька. Баю-баю ціхенька. / Мішка вочкі закрывай і на Надзю не ўзірай...» Апошнія два радкі я на хаду прыдумала *(усміхаецца)*. Так раней і рабілі нашы бабулі, пастаянна імправізавалі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Сосновая, дер. Скураты (по генплану № 23), дер. Малое Залужье, дер. Вишня, дер. Аношки Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	28 августа 2018 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 – площадь 0,1237 га № 624883010101000591 дер. Сосновая Лот № 2 – площадь 0,1500 га № 624883009101000213 дер. Скураты (по генплану № 23) Лот № 3 – площадь 0,1493 га № 624883006601000138 дер. Малое Залужье Лот № 4 – площадь 0,1499 га № 624883001801000042 дер. Вишня Лот № 5 – площадь 0,1500 га № 624883000201000114 дер. Аношки
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)
7	Начальная (стартовая) цена продажи	Лот № 1 – 30 000 рублей. Лот № 2 – 20 000 рублей. Лот № 3 – 10 000 рублей. Лот № 4 – 10 000 рублей. Лот № 5 – 25 000 рублей
8	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории страны; В) без права предоставления рассрочки
9	Наличие инженерной инфраструктуры	дер. Сосновая – подъездные пути дер. Скураты (г. п. № 23) – подъездные пути, электроснабжение дер. Малое Залужье – подъездные пути дер. Вишня – подъездные пути дер. Аношки – подъездные пути, электроснабжение
10	Ограничения в использовании	лот 2 – водоохранная зона реки Плиса (площадь 0,1500 га), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт (площадь 0,0014 га); лот 3 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,1493 га); лот 5 – водоохранная зона реки Усяж (площадь 0,1500 га)
11	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
12	Сумма задатка и реквизиты продавца	10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с BY50AKBB36410000006146200000 БИК AKBBBY21612 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
13	Порядок предварит. ознак. в натуре с зем. участками	Среда в 10.00
14	Прием документов	В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
15	Окончательный срок приема документов	22 августа 2018 года в 17.00
16	Контактные телефоны	8 01776 29-395, 68-030

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1636,73 руб., лот 2 – 1839,83 руб., лот 3 – 1716,27 руб., лот 4 – 1580,73 руб., лот 5 – 1779,03 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

ООО «Центр Белинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-331447, площадью 76,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 301-3. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007005030 площадью 0,2934 га (доля в праве постоянного пользования – 97/100). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами	**133 000,00**	**13 300,00**
2	Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-331445, площадью 82,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 301-2. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007005030 площадью 0,2934 га (доля в праве постоянного пользования – 97/100). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами	**144 000,00**	**14 400,00**

Срок подачи заявления	**По 7 августа 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**8 августа 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 26.07.2018 г.
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 5 (пять) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.06.2018 г.

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

Страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2 РП серии БМ № 0971373-0971380 **считать недействительными.**

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

10 августа 2018 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями № 09-У-18 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на пяти земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб.
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск в границах ул. Восточная – ул. Кольцова – пер. 4-й Полиграфический	1,0719	Для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Восточная – ул. Кольцова – пер. 4-й Полиграфический»	367 547,81	55 000,00	31 649,87	Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. Восточной, 184, 186, 188, 190; по пер. 4-му Полиграфическому, 10, 16, 16А, 18	5 385 698,55
2	г. Минск ул. Вышелесского – МКАД	1,56	Для строительства объекта «Автоцентр с паркингом на 700 м/м по ул. Вышелесского – МКАД»	647 728,05	90 000,00	8 904,93	Снос зданий и сооружений, попадающих под пятно застройки	332 647,84
3	г. Минск, ул. Белорусская	0,4301	Для строительства объекта «Молодежно-развлекательный центр с объектом общественного питания по ул. Белорусской»	288 908,98	43 000,00	8 953,54	Отселение и снос жилых и нежилых строений, попадающих под пятно застройки до начала строительно-монтажных работ по ул. Белорусской, 39Б и 39В	234 643,20 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 4 814,36 руб.*
Непокрытый убыток	(5 205)	(5 709)
Итого капитал	**44 531**	**43 544**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	**116 554**	**125 229**

Обобщенный отчет о прибыли или убытке и прочем совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2017 года	Год, закончившийся 31 декабря 2016 года
Процентные доходы	10 233	13 637
Процентные расходы	(3 084)	(4 233)
Чистый процентный доход до восстановления/(убытков от обесценения) по активам, по которым начисляются проценты	7 149	9 404
Восстановление резервов под обесценение/(убытки от обесценения) по активам, по которым начисляются проценты	1 223	539
Чистый процентный доход	**8 372**	**9 943**
Чистая прибыль по операциям с иностранной валютой	3 551	3 441
Чистая прибыль по операциям с производными финансовыми инструментами	-	44
Комиссионные доходы	2 377	2 172
Комиссионные расходы	(387)	(338)
Восстановление резервов под обесценение/(убытки от обесценения) по прочим операциям	2	24
Прочие доходы, нетто	116	153
Чистые непроцентные доходы	**5 659**	**5 496**
Операционные доходы	14 031	15 439
Операционные расходы	(9 756)	(9 433)
Прибыль до налогообложения	4 275	6 006
Расходы по налогу на прибыль	(746)	(607)
Чистая прибыль за год	**3 529**	**5 399**
Прочий совокупный доход		
Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в состав прибылей или убытков:		
Изменение справедливой стоимости финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	-	-
Реклассификация по финансовым активам, имеющимся в наличии для продажи, реализованным в течение года	-	53
Прочий совокупный доход	**-**	**53**
Итого совокупный доход	**3 529**	**5 452**

Обобщенный отчет об изменениях в собственном капитале за год, закончившийся 31 декабря 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

	Уставный капитал	Фонд переоценки инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	Непокрытый убыток	Итого капитал
31 декабря 2015 года	**44 581**	**(53)**	**(9 201)**	**35 327**
Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	4 672	-	-	**4 672**
Чистая прибыль за год	-	-	5 399	**5 399**
Прочий совокупный доход	-	53	-	**53**
Дивиденды объявленные	-	-	(1 907)	**(1 907)**
31 декабря 2016 года	**49 253**	**-**	**(5 709)**	**43 544**
Направление прибыли на пополнение уставного фонда	483	-	(483)	-
Чистая прибыль за год	-	-	3 529	**3 529**
Дивиденды объявленные	-	-	(2 542)	**(2 542)**
31 декабря 2017 года	**49 736**	**-**	**(5 205)**	**44 531**

Обобщенный отчет о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2017 года	Год, закончившийся 31 декабря 2016 года
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Прибыль до налогообложения	4 275	6 006
Корректировки:		
(Восстановление)/Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты	(1 223)	(539)
(Восстановление)/Формирование резервов по прочим операциям	(2)	(24)
Изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов	-	(9)
Амортизация основных средств и нематериальных активов	762	700
Чистый убыток от выбытия основных средств, нематериальных активов и прочего имущества	6	132
Курсовые разницы, нетто	(7)	(149)
Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов	27	1 136
Чистый (убыток)/прибыль от выбытия финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	(60)	3
Чистое изменение прочих начисленных доходов и расходов	(10)	(3)
Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств	3 768	7 253
Изменение операционных активов и обязательств		
(Увеличение)/уменьшение операционных активов:		
Минимальные обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь	(299)	(14)
Производные финансовые инструменты	-	73
Средства в банках	5	(698)
Кредиты, предоставленные клиентам	3 661	(4 640)
Прочие активы	359	376
Активы, удерживаемые до погашения	(511)	(2 073)
Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи	(98)	(446)
Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств:		
Средства банков	(17 046)	3 215
Средства клиентов	7 460	3 863
Прочие обязательства	39	89
Приток денежных средств от операционной деятельности до налогообложения	(2 662)	6 998
Налог на прибыль уплаченный, нетто	(582)	(210)
Чистый приток денежных средств от операционной деятельности	(3 244)	6 788
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Приобретение основных средств и нематериальных активов	(707)	(1 125)
Поступления от продажи основных средств	14	-
Погашение и продажа инвестиций в наличии для продажи	3 386	11 900
Приобретение финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	(1 003)	(11 758)
Приобретение активов, удерживаемых до погашения	(80 035)	(113 531)
Погашение активов, удерживаемых до погашения	101 873	103 714
Чистый отток денежных средств от инвестиционной деятельности	23 528	(10 800)
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:		
Дивиденды уплаченные	(2 542)	(1 907)
Выпуск облигаций	-	2 349
Погашение облигаций	-	(2 349)
Чистый отток денежных средств от финансовой деятельности	(2 542)	(1 907)
ЧИСТОЕ УВЕЛИЧЕНИЕ/(УМЕНЬШЕНИЕ) ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ	17 742	(5 919)
Влияние изменения курсов иностранных валют на денежные средства и их эквиваленты	505	(350)
Влияние инфляции на монетарные активы и обязательства	-	-
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало периода	11 631	17 900
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец периода	29 878	11 631
Дополнительная информация:		
Проценты выплаченные	(3 288)	(4 304)
Проценты полученные	10 464	14 844

Председатель Правления

А. В. Игнатов

Главный бухгалтер

Л. Б. Паденова

26 июня 2018 года

Минск

Deloitte.

Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»
ул. К. Цеткин, д. 51А. 13-й этаж,
Минск, 220004
Республика Беларусь
Тел.: +375 (17) 309 99 00
Факс: +375 (17) 309 99 01
deloitte.by

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА ПО ПУБЛИКУЕМОЙ ОБОБЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам и Совету директоров «Франсабанк» Открытого акционерного общества

Мнение

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность, состоящая из обобщенного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2017 года, обобщенных отчетов о прибыли или убытке и прочем совокупном доходе, об изменениях в собственном капитале и о движении денежных средств за 2017 год, составлена на основе аудированной финансовой отчетности «Франсабанк» Открытого акционерного общества (далее – «ОАО «Франсабанк» или «Банк») за 2017 год, подготовленной в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности. Мы выразили аудиторское мнение с оговоркой об указанной финансовой отчетности в нашем заключении от 26 июня 2018 года.

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая обобщенная финансовая отчетность согласуется во всех существенных аспектах с аудированной финансовой отчетностью, подготовленной в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, на основании критериев, приведенных в Инструкции «О раскрытии информации о деятельности банка, открытого акционерного общества «Банк Развития Республики Беларусь», небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга», утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года (далее – «Инструкция № 19»). Однако публикуемая обобщенная финансовая отчетность искажена в той же степени, что и аудированная финансовая отчетность ОАО «Франсабанк» за 2017 год.

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность

В публикуемой обобщенной финансовой отчетности не содержится вся необходимая информация, подлежащая раскрытию в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с публикуемой обобщенной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности не заменяет ознакомления с аудированной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности. В соответствии с требованиями Инструкции № 19 Банк размещает в полном объеме годовую финансовую отчетность, составленную в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, вместе с аудиторским заключением, составленным по результатам ее аудита, на своем интернет-сайте. Аудированная финансовая отчетность и публикуемая обобщенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты нашего аудиторского заключения по аудированной финансовой отчетности.

Аудированная финансовая отчетность и аудиторское заключение по данной отчетности

Мы выразили аудиторское мнение с оговоркой об аудированной финансовой отчетности в нашем заключении от 26 июня 2018 года. Основанием для выражения мнения с оговоркой стало отсутствие в финансовой отчетности корректировки на обесценение административного здания, являющегося объектом основных средств, с балансовой стоимостью 14,178 и 14,332 тыс. руб. на 31 декабря 2017 и 2016 годов соответственно, что является отклонением от требований МСБУ 36 «Обесценение активов». Если бы обесценение было отражено в финансовой отчетности, это привело бы к уменьшению балансовой стоимости основных средств и капитала по состоянию на 31 декабря 2016 года и прибыли до налогообложения за 2016 год на 4,504 тыс. руб. Мы не смогли надежно оценить влияние данного отклонения на балансовую стоимость здания по состоянию на 31 декабря 2017 года и, соответственно, прибыли до налогообложения за 2017 год.

Заключение по аудированной финансовой отчетности также включает информацию о ключевых вопросах аудита. Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, были наиболее значимыми для аудита финансовой отчетности за отчетный период.

Ответственность руководства за публикуемую обобщенную финансовую отчетность

Руководство отвечает за подготовку публикуемой обобщенной финансовой отчетности на основе аудированной годовой финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции № 19.

Ответственность аудитора

Наша ответственность заключается в выражении мнения о том, согласуется ли во всех существенных аспектах публикуемая обобщенная финансовая отчетность с аудированной финансовой отчетностью. Мнение выражено на основании процедур, выполненных в соответствии с Международным стандартом аудита («МСА») 810 (пересмотренным) «Задания по предоставлению заключения об обобщенной финансовой отчетности».

Deloitte & Touche

26 июня 2018 года
г. Минск, Беларусь

Генеральный директор иностранного унитарного предприятия «Делойт и Туш»

О. И. Степанеева
Квалификационный аттестат аудитора № 0001765 от 12 ноября 2009 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь
Свидетельство № 65 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 14 декабря 2011 года

Аудитор иностранного унитарного предприятия «Делойт и Туш»

Д. А. Бекешко
Квалификационный аттестат аудитора № 0002114 от 27 июня 2013 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь
Свидетельство № 71 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 9 октября 2013 года

Наименование аудируемой организации: «Франсабанк» Открытое акционерное общество
Юридический адрес: пр-т Независимости, 95А, г. Минск, 220012, Республика Беларусь
Регистрационные данные: зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 5 октября 1994 года (регистрационный номер 50).

Название аудиторской организации: иностранное унитарное аудиторское предприятие «Делойт и Туш».
Юридический адрес: ул. К. Цеткин, д. 51а, 220004, г. Минск, Республика Беларусь.
Регистрационные данные: свидетельство о государственной регистрации, выданное на основании решения МИД Республики Беларусь от 3 марта 2014 года № 0098185, УНП 101518377.

ОАО «Барановичхлебопродукт» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1 (повторный аукцион): капитальное строение с инв. № 110С-113806, адрес: Барановичский р-н, Полонковский с/с, 51, склад материалов, 0,8 км юго-западнее аг. Перховичи, площадь 282,8 кв. м, наименование – склад материалов. Начальная цена продажи с НДС (снижена на 20 %) – 14 208,00 руб. Сумма задатка – 1 420,80 руб. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 120488000001000102, площадь 0,3644 га, целевое назначение – для обслуживания склада материалов. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель, расположенных в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь охранной зоны – 0,3644 га.

Характеристики лота 1: год постройки – 1989; фундамент – бетон; наружн., внутр. стены – блок, кирпичи; перегородки – кирпичи; перекрытия – дерево; крыша – асбестоцементный волнистый лист; полы – нет; окна – стеклоблоки; ворота – дерево; отделка – нет; вентиляция – естественная; отопление, водоснабжение, канализация – нет.

Лот № 2 (повторный аукцион). Капитальное строение с инв. № 110С-113804, адрес: Барановичский р-н, Полонковский с/с, 51/1, склад материалов, 0,8 км юго-западнее аг. Перховичи, площадь 250,5 кв. м, наименование – склад материалов. Начальная цена продажи с НДС (снижена на 20 %) – 12 960,00 руб. Сумма задатка – 1 296,00 руб. Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 120488000001000034, площадь 0,1760 га, целевое назначение – для обслуживания склада материалов. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель, расположенных в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь охранной зоны – 0,1760 га.

Характеристики лота 2: год постройки – 1988; фундамент – бетон; наружн., внутр. стены – блок, кирпичи; перегородки – кирпичи; перекрытия – дерево; крыша – асбестоцементный волнистый лист; полы – нет; окна – стеклоблоки; ворота – дерево, отделка – нет; вентиляция – естественная; отопление, водоснабжение, канализация – нет.

Объявление о ранее проведенном аукционе по лотам 1, 2 было размещено 13.06.2018 в газете «Звязда».

Аукцион по продаже лотов 1, 2 состоится 06.08.2018 в 15.00. Заявления на участие в аукционе принимаются не позднее 14.00 06.08.2018.

Продавец и организатор аукциона – открытое акционерное общество «Барановичский комбинат хлебопродуктов», Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, тел./факс 8 (0163) 41-72-53. Место проведения аукционов: Брестская обл., г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, 2-й эт., актовый зал.

Порядок оформления участия в аукционе и его проведения определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже отдельных объектов, находящихся в собственности ОАО «Барановичхлебопродукт».

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости соответствующего лота перечисляется организатору аукциона на р/с BY29AKBB30120120000111300000 в филиале 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Барановичи, BIC: AKBBBY21802, УНП 200166738, получатель платежа – ОАО «Барановичхлебопродукт». Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы, в том числе документы, подтверждающие оплату задатка, принимаются по адресу: г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21, каб. 17 (юридический отдел) в рабочие дни с 08.00 до 16.30.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона оплатить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. Возможно предоставление рассрочки оплаты по соглашению сторон.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72

Предмет аукциона
Месторасположение – Минская обл., Минский р-н, д. Захаричи, ДСЗ «Заславль

№ лота	Инв. номер по бухучету	Наименование	Начальная цена лота с НДС, бел. руб.
1	2849	**Трансформаторная подстанция ПКПП 400,** 1986 г. в.	1 802,40
2	156	**Трансформаторная подстанция ТП-2 (630/6),** 1967 г. в.	1 778,40
3	1023	**Станок радиально-сверлильный 2Е52,** 1967 г. в.	794,40
4	3068	**Станок вертикально-сверлильный 2А125**	554,40
5	1057	**Станок токарно-винторезный 1К62,** 1977 г. в.	914,40
6	1013	**Станок токарно-винторезный 163,** 1967 г. в.	1 514,40
7	608	**Кран мостовой однобалочный с электроталью и подкрановыми путями,** 1967 г. в.	1 586,40
8	1017	**Кран мостовой однобалочный с электроталью и подкрановыми путями,** 1967 г. в.	1 586,40
9	1016	**Кран мостовой однобалочный с электроталью и подкрановыми путями,** 1967 г. в.	1 058,40
10	1015	**Кран мостовой однобалочный с электроталью и подкрановыми путями,** 1967 г. в.	1 058,40
11	100233	**Кран мостовой однобалочный с электроталью и подкрановыми путями,** 1967 г. в.	1 586,40
12	2339	**Кран козловой с электроталью двухконсольный,** 1974 г. в.	5 234,40
13	101026	**Станок консольно-фрезерный 6М82Г,** 1967 г. в.	674,40
14	1020	**Станок поперечно-строгальный 7Б35,** 1967 г. в.	1 034,40
15	1058	**Станок отрезной круглопильный 8В66А,** 1972 г. в.	1 634,40
16	1021	**Молот пневматический,** 1967 г. в.	1 274,40
17	2079	**Станок радиально-сверлильный М257,** 1967 г. в.	2 474,40

Условие демонтажа и самовывоза	Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**30.08.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**28.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Извещение о проведении аукциона по продаже имущества ликвидируемого ООО «СИДКОМ»

ООО «СИДКОМ» извещает о проведении аукциона в связи с ликвидацией.

Продавец и организатор торгов: Общество с ограниченной ответственностью «СИДКОМ», Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Торговая, д.14а.

Ликвидатор – ООО «Точка закона», тел. +375 1775 53707, +375 29 1901963.

Порядок проведения торгов, требования к участникам торгов, документы, прилагаемые к заявлениям на участие, порядок проведения торгов, порядок заключения договора по результатам торгов и расчетов определяется в соответствии с Положением о порядке проведения продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, которое утверждено постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 16 от 08.01.2013 г. «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого должника» (с последующими изменениями и дополнениями).

Дата проведения аукциона: 30 августа 2018 г. в 11.00.

Место проведения аукциона: Минская обл., г. Жодино, ул. Сухогрядская, д. 11, каб. 32.

Место нахождения продаваемого имущества:

1) г. Жодино, ул. Московская, д. 64б (лот 1).

Заявления на участие в аукционе с необходимыми прилагаемыми документами в соответствии с законодательством принимаются с 9.00 до 13.00 в будние дни по адресу: г. Жодино, ул. Сухогрядская, д. 11 каб. 32 с 30.07.2018 по 29.08.2018 г.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Порядок ознакомления: ознакомление производится в будние дни с 9.00 до 13.00. Ответственное лицо: Доморонок Игорь Иванович, тел. +375 1775 53707, +375 29 1901963.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется по следующим реквизитам р/счет BY67AKBB30120616038786200000 в ЦБУ №616 филиала № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Жодино, 25, код AKBBBY21612.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № лота, дата аукциона).

Задаток перечисляется в установленном размере не позднее указанного срока окончания приема документов на участие в аукционе.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленного для каждого из лотов.

Победитель аукциона возмещает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в течение 5 (пяти) дней с даты проведения аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Срок оплаты: не более 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %, либо иным способом, не противоречащим законодательству Республики Беларусь.

Список имущества (лот № 1):

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость (без НДС), руб/ доллары США
1	Капитальное строение с инв. № 612/С-6270 (назначение: здание неустановленного назначения)	130 000/ 65 267,60
	Капитальное строение с инв. № 612/С-6271 (назначение: здание специализированное иного назначения)	71 000/ 35 646,15
	Капитальное строение с инв. № 612/С-6272 (назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей)	81 000/ 40 666, 73

УНП 690603371

МОРА БОЛЬШ НЕ ХВАЛЮЕЦЦА

ЛЕТНЯЯ «МЕККА»

Гарачы поўдзень суботняга дня. Такое надвор'е на выхадныя не выпадала ўжо даўно. Не дзіўна, што ў электрычцы, якая праходзіць праз станцыю «Мінскае мора», збіраецца шмат народу. Вось у тамбуры прымасціліся трое маладых людзей з веласіпедамі і вялізнымі паходнымі заплечнікамі. А ў канцы вагона весела перагаворваецца група падлеткаў. Мяркуючы па размовах, гэта абітурыенты, якія нарэшце выдыхнулі пасля залічэння на бюджэт. Едуць адзначаць. Насупраць іх уладкавалася шматдзетная сям'я, самае малодшае дзіця ціха дрэмле ў калысцы, у той час як дзве старэйшыя пагодкі абмяркоўваюць, якія фігуры з пяску кожная з іх збіраецца пабудаваць. Як толькі пры пад'ездзе да станцыі цягнік запавольвае свой ход, не менш за палову пасажыраў падымаецца са сваіх месцаў — наперад, да мора!

Вось каб адпачынак ва ўсіх гэтых розных людзей прайшоў аднолькава спакойна, кожны дзень, без выключэння, на тэрыторыі зон адпачынку нясуць службу супрацоўнікі міліцыі: як пешымі нарадамі, так і аўтапатруляваннем. Тэрыторыя Мінскага мора знаходзіцца ў падпарадкаванні Мінскага РУУС. А дапамагаюць патруляваць яе салдаты тэрміновай службы ўнутраных войскаў МУС. Усяго ж у Мінскай вобласці шэсць вадаёмаў з абсталяванымі пляжамі: тое самае Заслаўскае вадасховішча, Дразды, Крыніца, Вяча, Пціч і Дуброўскае вадасховішча. На Мінскае мора мы адправіліся, бо традыцыйна яно лічыцца самым шматлюдным. У гэтым годзе на Дзень Перамогі, калі свята выпала на сярэдзіну тыдня, а, значыць, магчымасці з'ехаць далёка ў жыхароў сталіцы не было, тут сабралася каля 50 тысяч чалавек!

Усяго ж тут дзевяць пляжаў, з аднаго боку берагавой лініі частка з іх расцягнулася адразу на пяць кіламетраў. Кожны пляж патрулюе асобны нарад. Прычым, як падкрэслівае **камандзір роты патрульна-паставой службы Мінскага РУУС падпалкоўнік міліцыі Юрый ШЧАРБАКОЎ,** галоўная задача супрацоўнікаў — менавіта прафілактыка. Дарэчы, у параўнанні з тым, што было яшчэ некалькі гадоў таму, абстаноўка значна палепшылася.

НА ДНЕ

Найлепшай ілюстрацыяй да гэтых слоў з'яўляецца тое, што адбываецца на беразе. Здаецца, нібыта на нейкія асаблівыя спаборніцтвы адразу па ўсіх відах спорту: тут і бадмінтон, і валейбол, і футбол, і фрысбі, і, вядома, плаванне. Людзі нарэшце пачалі змяняць сваё ўяўленне аб адпачынку на прыродзе адносна таго, што «шашлычок» не абавязкова толькі «пад каньячок», і на свежым паветры ёсць шмат іншых спосабаў цікава правесці час. Але сустракаюцца і выключэнні. Так практычна каля самай дарогі (а навошта замарочвацца?) натыкаемся на «вясёлую» кампанію: два хлопцы і дзяўчына. Адзін з маладых людзей спіць непрабудным сном, у той час як пара працягвае свой «банкет». Моцны алкаголь ідзе ўперамешку з півам, што прыкметна і па іх стане. Адзін той факт, што замест купальніка дзяўчына загарае ў бялізне, вельмі красамоўны.

— Распіццё спіртных напояў у грамадскіх месцах забаронена.

— Мы ж пакрыху, — ледзь вымаўляе дзяўчына. — Добра-добра, можа, і праўда пара дадому. Зараз толькі наш сябар прачнецца. Ён стаміўся.

Пакуль мы размаўляем, маладыя людзі пачынаюць спрабаваць збіраць рэчы, але выходзіць з цяжкасцю. Мне здаецца непраўдападобным іх жаданне адправіцца дадому. Але, калі пасля абыходу пляжа мы вяртаемся назад, пра іх ранейшую прысутнасць нагадвае толькі прымятая посцілкаю трава.

Больш такіх выпадкаў мы не сустрэлі. У асноўным на пляжы адпачываюць сем'і ці маладыя людзі па два-тры чалавекі. Вялікія кампаніі аддаюць перавагу альтанкам. Балазе, сёлета іх стала яшчэ больш. Як і мангалаў, лавак, дзіцячых пляцовак і ўсяго таго абсталявання, якое трэба, каб забяспечыць усе выгоды цывілізацыі.

ПІЛЬНЫМ ВОКАМ

Праходзячы ўздоўж пляжа, заўважаем два ручнікі, на якіх ляжаць адкрытыя сумкі. З адной з іх прызыўна выглядвае планшэт. Пакуль мы затрымліваемся каля рэчаў, з вады паспяваюць выйсці дзве дзяўчыны.

— Навошта вы рэчы без нагляду пакідаеце, тым больш у адкрытым выглядзе?

— Дык мы ж ненадоўга. І стараліся вачэй з берага не адводзіць.

— Няўжо нельга па адной пакупацца?

— Разам жа весялей, — смяюцца сяброўкі.

Праўда, скончыцца такая бязладнасць можа зусім нявесела. Менавіта таму прафілактыка крадзяжоў, нароўні з прафілактыкай п'янства, — адзін з асноўных кірункаў дзейнасці міліцыі ў зонах адпачынку. Як тлумачыць Юрый Шчарбакоў, супрацоўнікі заўсёды прыкмячаюць пакінутыя без нагляду рэчы, імкнуцца дачакацца іх уладальнікаў і растлумачыць, што рабіць так не варта. Калі маршрут пралягае ўздоўж стаянкі машын, то праваахоўнікі звяртаюць увагу і на тое, каб няпамятлівыя кіроўцы не пакідалі адкрытымі вокны ці каштоўныя рэчы навідавоку. У гэтым выпадку яны звычайна тэлефануюць уладальнікам машын па пакінутым на лабавым шкле тэлефоне. Пазалетась была здзейснена серыя крадзяжоў з прыпаркаваных аўтамабіляў: злачынцаў хутка знайшлі, але пра тое, што захаванасць маёмасці залежыць шмат у чым ад яе ўладальнікаў, працягваюць нагадваць да гэтага часу.

Дарэчы, усім аўтаўладальнікам спецыялісты рэкамендуюць заўсёды пакідаць картку з нумарам. Гэта дапамагло б вырашыць вялікую частку канфліктаў. Бо часцей за ўсё з тэрыторыі зон адпачынку звяртаюцца ў ДАІ з праблемай, што адна машына перакрыла іншай выезд са стаянкі. Пакуль, на жаль, абсталяваных месцаў для паркоўкі ўздоўж пляжаў значна менш, чым трэба для гарачых дзён. Дарэчы, супрацоўнікі ДАІ ў цёплы перыяд таксама ўвесь час дзяжураць у межах зон адпачынку — і на сітуацыі на дарогах гэта адбіваецца станоўчым чынам.

БРЫЗ ПЕРАМЕН

Дарэчы, супрацоўнікі міліцыі, калі неабходна, дапамагаюць і ратавальнікам. У роты ёсць нават уласная маторная лодка. Для некаторых адпачывальнікаў просьба не заплываць за буйкі гучыць як выклік. Нават пасля ўгаворaў ратавальнікаў, не кожны гатовы змірыцца і «плюхацца на мелкаводдзі з малышнёй». У гэтым выпадку эфектыўней за ўсё дзейнічае згадванне адказнасці за адміністрацыйнае правапарушэнне ад супрацоўнікаў у форме. Адразу і патрабаванні здаюцца аб'ектыўнымі, і глыбіня сапраўды занадта вялікай.

Наогул абстаноўку можна назваць спакойнай па ўсіх зонах адпачынку. У сярэднім у цёплы дзень на іх тэрыторыі затрымліваюць не больш за дзесяць чалавек, гэта з улікам правапарушэнняў па лініі ДАІ. Што датычыцца сур'ёзных здарэнняў, то за апошнія два сезоны іх, на шчасце, не было. Хутчэй за ўсё, уплываюць усе змены ў сукупнасці...

Напрыклад, ужо рука сама цягнецца да пакета са смеццем, каб данесці яго да сметніцы, — на дарозе іх дастаткова. Ужо няма больш крыўдаў, што на тэрыторыю пляжа заязджаць на машыне нельга — бо толькі так можна адчуць сябе сапраўды расслабленым. Ужо ніхто не разводзіць вогнішчы — ёсць стацыянарныя мангалы, ды і свой, як аказалася, захапіць не так складана. Не прадаюць на тэрыторыі пляжаў больш піва, ды і з безалкагольнымі напоямі дзень не становіцца горшы. І яшчэ, і яшчэ... Нездарма кажуць, што асяроддзе вызначае свядомасць. Крыху больш намаганняў з боку гарадскіх службаў — і мінчане сталі паводзіць сябе па-іншаму. Будзем лічыць гэта такім спосабам калектыўна сказаць «дзякуй».

Што да правапарадку, то, напэўна, прыйшло разуменне, што ўсяму сваё месца і час. Адпачынак з сем'ямі на пляжы і паход у начны бар — гэта не адно і тое ж. І ўвогуле, галоўнае — памятаць, што камфортна павінна быць не толькі вам, але і тым, хто побач. А калі гэта раптоўна вылецела з галавы, ёсць каму пра гэта мякка нагадаць.

Дар'я КАСКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ На экранах

Як гэта — стаць чалавекам

Дзяўчына, якая не можа плакаць, прымусіць вас абліваццa слязьмі

Будучыня зноў уяўляецца меланхалічнай, сумнай і адзінокай, нібы тут патаптаўся Рыдлі Скот з яго «Бягучым па лязе», а ён тут сапраўды патаптаўся. І ўсе фарбы свету, прасунутасць, тэхналогіі становяцца фонам для гісторыі двух страчаных у гэтай прасторы людзей. Фільм «Зоі» Дрэйка Дорымуса складаецца са смутку: пасля прагляду вы зразумееце, што дасюль нічога не ведалі пра меланхолію. І ў той жа час узносіць каханне, якое, як вядома з «Бягучага па лязе», нават штучных людзей робіць сапраўднымі.

Спецыяльная лабараторыя стварае так званых сінтэтыкаў, якія павінны стаць ідэальнымі партнёрамі і ніколі не дазволіць чалавеку пакутаваць з-за адносін. А акрамя таго правярае людзей на сумяшчальнасць, прагназуе будучыню пар і стварае таблеткі, якія даюць магчымасць на некалькі гадзін выпрабаваць пачуццё першай закаханасці.

Коўл у выкананні Юэна МакГрэгара з'яўляецца таленавітым навукоўцам, а шыкоўная ў сваіх суме і адзіноце Зоі, якую іграе Леа Сейду, кіруе адным з аддзелаў. Дзяўчына пяшчотна закаханая ў Коўла, але вынікам тэста, які аднойчы ўвечары яна вырашае зрабіць у сябе ў лабараторыі, аказаліся нуль працэнтаў, фундаментальная несумяшчальнасць.

Як і ў фільме «Бягучы па лязе», дзе адным з галоўных герояў была так званы рэплікант Рэйчэл, якая лічыла сябе чалавекам і з'яўлялася супрацоўнікам карпарацыі, што стварае рэплікантаў, Зоі даведваецца пра сваю штучную прыроду.

Фільм Дрэйка Дорымуса нівелюе страх і прадузятасць перад робатамі — ён ажыўляе іх, надзяляе нібыта выключна чалавечымі якасцямі, прымушае суперажываць іх бядзе. Больш за тое, «Зоі» і цікавіцца менавіта штучнымі людзьмі: іх пачуццём згубленасці і непатрэбнасці, тым, як складана ім знайсці месца ў свеце чалавека, іх татальнай адзінотай. Гэта драма лішніх людзей, якія аказваюцца кінутымі, як толькі іх функцыя сябе вычэрпвае.

Усведамленне сябе несапраўднай прыгожа становіцца асновай асабістай драмы галоўнай гераіні і лёгка параўноўваецца з глыбокімі ўзрушэннямі звычайнага чалавека. Таму і межы паміж сінтэтыкамі і людзьмі ў выніку размываюцца. Калі Зоі можа пакутаваць, адчуваць і трансляваць усёпаглынальную меланхолію, калі ў сваіх паводзінах яна праяўляе тыповыя жаночыя рашэнні і ўсё гэта пад музыку, якая разам з сюжэтам не дае вачам прасохнуць, яна становіцца бліжэй да чалавечага, чым многія з нас.

Выдатна ў гэтую ролю ўлілася Леа Сэйду, якая на сваім твары не паказала ніводнай лішняй эмоцыі, затое кожным рухам дапоўніла вобраз дзяўчыны, якая глыбока пакутуе, прычым не напаказ, не яўна, не гучна.

Коўл і Зоі ў выніку становяцца парай, пакуль у вучонага не з'яўляецца нагода ўспомніць, што ўнутры яго дзяўчына — іншая. Тады яны разыходзяцца і аддаюцца таму, што прапануюць сучасныя тэхналогіі.

Гісторыя двух герояў, якая развіваецца на фоне прасунутага свету, нязмушана стварае вобраз будучыні: хоць новыя распрацоўкі дэкларуюць, што ў ёй няма адзіноты, адзінота тут пануе. Людзі аддаюцца таблеткам, якія дазваляюць закахацца, але, здаецца, маюць справу толькі з эрзацамі пачуццяў. Усё гэта сапраўднае/штучнае абыгрываецца на розных узроўнях, але вынік толькі адзін, прадказальны ў кантэксце кінадрамы, — гэта азначэнне залежыць не ад штучнасці самой па сабе, а ад здольнасці кахаць. Таму межы перамясціліся і Зоі аказалася ў шэрагу сапраўдных. Яе калега-сінтэтык Эш пытаецца: «Як гэта — стаць чалавекам?»

Так вобраз будучыні, адзінокая Леа Сэйду за барнай стойкай, найноўшыя распрацоўкі становяцца асновай меладрамы: вось гісторыя кахання, перыпетыі і нават банальны фінал. Хоць больш бы нам такіх меладрам, з выкшталцонай працай над атмасферай, шырокай перспектывай і аглядкай на чалавецтва ўвогуле.

«Зоі» — сумны і шчаслівы фільм адначасова. Хоць гісторыя галоўных герояў завяршаецца, можна сказаць, хэпі-эндам, агульная атмасфера паказвае невядомы свет, дзе робаты шукаюць сябе, аддаюць перавагу дэактывацыі альбо аказваюцца непатрэбнымі на вуліцы. На такім фоне — праз сінтэтыка, каханне якога з'яўляецца толькі спецыяльным кодам, — сапраўдныя пачуцці сцвердзіць прасцей.

Павольнасць, вечаровыя прыцемкі, музычныя матывы, асабістыя драмы, непатрэбныя людзі, прага сацыялізацыі і сумны твар Леі Сейду робяць гэты фільм найлепшай меладрамай, якую зараз прапануе вялікі экран.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

Даты Падзеі Людзі

26 ЛІПЕНЯ

У краіне

1918 год — нарадзіўся (вёска Закружка Мінскага раёна) Іван Грамовіч, пісьменнік, перакладчык, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працаваў у перыядычным друку, на кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтар кніг «Першага верасня», «Сям'я Вішнёвых», «Сонца скрозь воблакі» і інш. Пісаў нарысы, публіцыстычныя артыкулы, сцэнарыі фільмаў. Пераклады на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, малдаўскіх пісьменнікаў. Памёр у 1986 годзе.

1918 год — нарадзіўся (г. Мсціслаў) Кусіэль Саламонавіч Шыфрын, савецкі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Стваральнік навуковай школы па оптыцы атмасферы і акіяна. Аўтар навуковых прац па электроннай тэорыі цвёрдага цела, тэорыі рассеівання электрамагнітных хваляў, радыёлакацыйнай метэаралогіі, атмасфернай оптыцы, фізічнай акеаналогіі. Памёр у 2011 годзе.

У свеце

1925 год — упершыню падняўся ў паветра самалёт К-1 канструкцыі К. А. Калініна — першы савецкі пасажырскі самалёт, рэкамендаваны да серыйнага выпуску.

1928 год — нарадзіўся Стэнлі Кубрык, амерыканскі кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсар. Паставіў фільмы «Спартак», «Касмічная адысея», «Лаліта» і многія іншыя. Лаўрэат шматлікіх прэстыжных прэмій у галіне кінамастацтва. Памёр у 1999 годзе.

1940 год — у СССР была прынята на ўзбраенне аўтамабільная радыёлакацыйная станцыя «Рэдут» (імпульсны «радыёўлоўнік» самалётаў РУС-2), якая стала да пачатку Вялікай Айчыннай вайны асноўным сродкам навядзення знішчальнікаў ППА.

1945 год — у Патсдаме ад імя ўрадаў Вялікабрытаніі, ЗША і Кітая была апублікаваная дэкларацыя, якая патрабавала безумоўнай капітуляцыі Японіі ў Другой сусветнай вайне і ўтрымлівала асноўныя прынцыпы мірнага ўрэгулявання. Пасля адхілення (28 ліпеня) гэтых патрабаванняў японскім урадам 8 жніўня да дэкларацыі далучыўся СССР і абвясціў Японіі вайну. 14 жніўня Японія прыняла ўмовы дэкларацыі. 2 верасня 1945 года быў падпісаны акт аб капітуляцыі Японіі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.13	21.18	16.05
Віцебск —	4.56	21.14	16.18
Магілёў —	5.03	21.08	16.05
Гомель —	5.07	20.58	15.51
Гродна —	5.30	21.32	16.02
Брэст —	5.38	21.26	15.48

Месяц

Першая квадра ***19 ліпеня.***

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.*

К. *Ганны, Гражыны, Міраславы, Аўхіма, Лаўрэнція.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ізя, у вас чай ёсць?
— Няма.
— А кава?
— Чай ёсць.

Аб'ява.
Самотны мужчына шукае кахання, пяшчоты, разумення і чаго-небудзь паесці.

Бясплатным урачам ніяк не можаш даказаць, што ты хворы...
...А платным, што здаровы!

Займальная статыстыка: мужчыны, якім аднойчы ўдалося даказаць, што яны маюць рацыю, ужо даўно разведзеныя.

Жонка мужу:
— Дарагі, выкінь смецце.
Муж:
— Не, сёння ляніва.
Жонка:
— Ну, тады паеш хаця б.
Муж:
— Вось заўсёды б так: калі не хочаш смецце выкідаць, то альтэрнатыва — паесці!
Цешча:
— Ну смецце ж трэба некуды дзяваць!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2695.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12